СПЯВАЦЬ ПАЧАЎ РАНЕЙ, ЧЫМ ГАВАРЫЦЬ

ЧЫРВОНКА



НА АДНОЙ ХВАЛІ З ТАНЦПАДЛОГАЙ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

26 ЖНІЎНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 163 (29532)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Кітай — наш найважнейшы стратэгічны партнёр. Сёлета мы адзначаем пяцігоддзе з дня ўстанаўлення лідарамі нашых дзяржаў найвышэйшага ўзроўню ў гісторыі беларуска-кітайскіх адносін — даверлівага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, а налета — 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Наша гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва характарызуецца паступальным ростам і дынамікай. Кітай уваходзіць у тройку найбуйнейшых гандлёвых партнёраў Беларусі: у 2020 годзе тавараабарот з КНР склаў рэкордныя $4,6 млрд і ў параўнанні з 2011 годам вырас на 60 %. Нягледзячы на пандэмію, беларускі экспарт тавараў і паслуг у Кітай працягвае няўхільна расці. Больш за сотню беларускіх прадпрыемстваў акрэдытавана і наладжана на работу на кітайскім рынку, а ўрады дзвюх краін — на зняцце гандлёвых бар'ераў і ліквідацыю абмежаванняў».

Гаспадар на зямлі

Шчаслівае кола

Фота БелТА

Мікалай ПРЫГОДЗІЧ з СВК імя Дзеншчыкова Гродзенскага раёна — адзін з лідараў сёлетняга жніва ў вобласці, ён першы ў рэгіёне намалаціў больш за чатыры тысячы тон збожжа новага ўраджаю. Павіншаваць работніка са значным дасягненнем прыехаў у поле старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік. Таксама камбайнера павіншавалі прадстаўнікі прафсаюзаў.

КАРАТКА

• Прэзідэнт перадаў партыю сабраных з асабістага падворка кавуноў пацыентам дзіцячай інфекцыйнай бальніцы Мінска.

• **У дзіцячых садках Мінска плануюць арганізаваць 190 груп з беларускай мовай навучання.**

• «Белавія» працягнула прыпыненне палётаў ва Украіну да 30 верасня.

ISSN 1990 — 763X

НеЧарнобыль, або Вяртанне дадому

ПЕРШЫЯ ЗВАНКІ І КЛЮЧЫ АД НОВЫХ КВАТЭР

Адзін з найважнейшых кірункаў новай праграмы па комплексным развіцці раёнаў Гомельскай вобласці, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС, — замацаванне маладых спецыялістаў. Спрыяе гэтаму, безумоўна, забеспячэнне жыллём. Цікава прасачыць, як перспектыўныя кірункі адраджэння «чарнобыльскіх» зямель пераклікаюцца з работай і жыццём людзей непасрэдна ў раёнах. Новы праект «НеЧарнобыль, або Вяртанне дадому» гэтым разам запрашае ў Нараўлянскі, Хойніцкі і Брагінскі раёны, дзе маладыя спецыялісты, сем'і з дзецьмі ладзяць уваходзіны.

Навасёлы сарака-кватэрнага жылога дома ў Хойніках Марына ВАРАБЕЙ з дачкой Ксеніяй і сынам Дзянісам.

СТАР. 4

Прыкметы часу

ПАТРЭБНАЕ НЕПАТРЭБНАЕ

Хто і навошта сёння здае бутэлькі, металалом і макулатуру

Паводле статыстыкі, адзін сучасны чалавек «вырабляе» ў год 250—300 кілаграмаў смецця. А цяпер уявім, колькі непатрэбнага пакідаюць за год сто чалавек, тысяча, мільён. Зрэшты, многае з гэтага непатрэбнага — на самай справе вельмі патрэбнае, бо прыдатнае для перапрацоўкі. Перапрацоўка адходаў эканоміць у сярэднім каля 80—90 працэнтаў рэсурсаў і энергіі, якія былі б выдаткаваныя на вытворчасць новага вырабу з нуля.

Зрэшты, «непатрэбнае смецце» часам становіцца прадметам спрэчкі паміж суседзямі, а нярэдка нават фігуруе ў міліцэйскіх зводках. Напрыклад, у адным з раённых цэнтраў адбылася такая гісторыя: суседка скрала ў суседа 500 кілаграмаў металалому. Той атрымаў у спадчыну бацькоўскі дом і рэдка ў ім бываў. Прадпрымальная суседка вывезла з яго ўчастка металічныя рэчы і здала ў пункт прыёму другаснай сыравіны. Выявіўшы прапажу, пацярпелы звярнуўся ў міліцыю.

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Я марыў пра тое, што мы пачнём рабіць свае камбайны. Мара спраўдзілася»

Беларускае камбайнабудаванне адзначыла сваё 25-годдзе. 24 жніўня 1996 года Прэзідэнт Беларусі на палях саўгаса «Веткаўскі» азнаёміўся са збожжаўборачным комплексам КЗС-10 «Палессе-Ротар». Работу камбайна апрабавалі ў розных умовах, і Аляксандр Лукашэнка дазволіў інвеставаць у стварэнне першай партыі. Такім чынам у краіне з'явілася новая галіна сельскагаспадарчага машынабудавання — збожжаўборачнае камбайнабудаванне.

ГІСТАРЫЧНАЕ РАШЭННЕ

Прайшло чвэрць стагоддзя. За гэты не такі вялікі для машынабудавання час у АПК Беларусі усё-ткі адбыліся значныя змены. Сёння выпускаюцца 11 мадэляў тэхнікі ў 75 мадыфікацыях. Яшчэ сем новых мадэляў у хуткім часе будуць запушчаны ў вытворчасць.

«Пройдзены каласальны шлях», — расказаў **генеральны канструктар навукова-тэхнічнага цэнтра камбайнабудавання ААТ «Гомсельмаш» Сяргей ФЕДАРОВІЧ**. Ён стаяў каля вытокаў такой дзейнасці і сёння падкрэслівае, што рашэнне аб стварэнні айчыннага збожжаўборачнага камбайнабудавання было гістарычным. Але і цяпер прамыслоўцы не стаяць на месцы.

«Мы сёння маем машыны ў васьмі класах і па шэрагу мадэляў ужо два разы рабілі абнаўленне. У найбліжэйшы час плануем уводзіць больш дасканалыя мадэлі ў традыцыйных класах, — дзеліцца планамі канструктар. — «Гомсельмаш» сур'ёзна працуе над тым, каб задавальняць спажыўца ва ўсіх сектарах збожжаўборачнага камбайнабудавання».

Павіншаваць вытворцаў камбайнаў учора прыехаў і Прэзідэнт. Яны, у сваю чаргу, падрыхтавалі для беларускага лідара выстаўку сваіх дасягненняў, своеасаблівую рэтраспектыву — ад мадэлі, з якой усё пачалося, да навінак. На полі гаспадаркі «Астрошыцы», што на Лагойшчыне, размясціліся збожжаўборачныя камбайны розных мадэляў «Гомсельмаша», пасяўны комплекс, самаходны апрысквальнік «Лідаграпрамаша» (уваходзіць у склад «Гомсельмаша»), сеялка «Амкадора».

«Мерапрыемства крыху сімвалічнае. Але прысвечана вельмі важнаму этапу ў развіцці нашай дзяржавы. Нават не сельскай гаспадаркі. ***Мы добра памятаем, калі людзям есці не было чаго, людзей трэба было накарміць. Здарылася так, што хлеб у полі быў, а ўбіраць яго не было чым.*** І вось тады прымаліся сур'ёзныя рашэнні ў плане таго, чым убіраць хлеб», — расказаў Аляксандр Лукашэнка аб кантэксце развіцця краіны, у якім вырашылі займацца камбайнабудаваннем.

Па словах кіраўніка дзяржавы, рашэнне было цяжкае. Гучалі прапановы адмовіцца ад вытворчасці ўласнай уборачнай тэхнікі і купляць яе ў Германіі. Аднак за пару гадоў айчынным прамыслоўцам удалося выпусціць сваю машыну. «Мы захавалі ўраджай. Гэта нам дало магчымасць падысці да стварэння цалкам новых камбайнаў, якія сёння ўжо канкуруюць з тымі ж нямецкімі. Накармілі людзей, спакойна пачалі праводзіць уборачную кампанію. Сёння маем усю лінейку сельскагаспадарчай тэхнікі», — канстатаваў Прэзідэнт.

ПЛАНЫ НА БУДУЧЫНЮ

Па словах **генеральнага дырэктара «Гомсельмаша» Аляксандра НОВІКАВА**, калі летась холдынг выпусціў крыху больш за 1,8 тысячы самаходных машын, то за гэтае першае паўгоддзе — амаль тысячу адзінак тэхнікі. «Плануем да заканчэння года выпусціць 2 170 машын. У нас ужо практычна да сярэдзіны наступнага года сфарміраваны пакет заказаў», — праінфармаваў ён.

Аляксандр Новікаў распавёў кіраўніку дзяржавы аб перспектывах развіцця прадпрыемства на будучы год. Усяго ў свеце ў камбайнабудаванні сёння каціруюцца камбайны 9-га і 10-га класаў. Беларусы робяць поўную лінейку ад 6 да 9 класа — не адстаюць ад лідараў.

«Мы ў Гомелі можам забяспечыць усю краіну камбайнамі. Мы больш прадаём, чым спажываем у сябе», — выказаў думку Прэзідэнт.

«Так, 70 працэнтаў у нас ідзе на экспарт, — сказаў гендырэктар і дадаў: — Дапамагла і пандэмія. Дэфіцыт пэўны сфарміраваўся. Але дзесьці троху і падкасіла — сталі больш доўгія ланцужкі паставак разнастайных камплектуючых. Былі збоі ў рабоце канвеераў».

Аляксандр Новікаў на пытанне пра супрацоўніцтва з еўрапейскімі пастаўшчыкамі камплектуючых адказаў: рухавікі пастаўляюць у час, а вось праблемы ёсць са складанай гідраўлікай і інтэгральнымі мікрасхемамі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сваім патрабаванні больш актыўна займацца імпартазамяшчэннем, хоць менавіта на «Гомсельмашы» ў гэтым кірунку зроблена нямала: за апошнія пяць гадоў імпартаёмістасць вытворчасці скарочана ў два разы.

«Трэба напружвацца цяпер. Так, санкцыі, дрэнна. Але неабходна займацца імпартазамяшчэннем, — падкрэсліў Прэзідэнт — Гэта трэба рабіць. А то ***мы «жалеза» робім, а «разумныя» вузлы — гідраўліку, электроніку — купляем на Захадзе. Трэба самім гэта рабіць»***.

Прэзідэнт працягнуў, што свет сёння ўзаемазалежны: калі сам не ўмееш нешта рабіць — заўтра навучышся, купіш, нешта скапіруеш, палепшыш.

«Галоўнае, я марыў пра тое, што мы пачнем рабіць свае камбайны. Вось — мара спраўдзілася», — канстатаваў Прэзідэнт.

У завяршэнне мерапрыемства Аляксандру Лукашэнку падарылі зменшаную копію таго самага першага айчыннага збожжаўборачнага камбайна.

КАВУНЫ ДЛЯ ГУБЕРНАТАРА

Закранулі падчас агляду тэхнікі і праблемныя пункты ў АПК сталічнага рэгіёна. «Трэба рэальна паказваць. Каб мне не КДК дакладваў, што там творыцца», — кажа Прэзідэнт.

Губернатар Аляксандр Турчын запрашае ў гаспадарку Кляновічы, якая за год падняла ўдоі амаль у два разы, і ў Крупкі, каб паказаць свае планы па развіцці раёна.

«Мы павінны сёлета, увосень туды прыехаць. І там павінен быць той узровень, які можна дасягнуць. Ад цябе не патрабуюць надзвычайнага. Але зрабі, каб не было зарасніку, каб быў парадак,— акцэнтуе Прэзідэнт увагу губернатара. — Бо атрымліваецца так: дзесьці нешта падрыхтавалі, прыехалі, адзначыліся, паглядзелі па тэлевізары. А ў іншых месцах недахопы».

Аляксандр Лукашэнка згадаў свой прысядзібны ўчастак, на якім ён не проста вырошчвае культуры, а эксперыментуе, правярае напрацоўкі беларускіх вучоных.

«Кавуны — гэта не таму, што піяр нейкі. Гэта эксперыменты. Я пачынаў з аднаго галандскага сорту. Учора мы збіралі пяць розных сартоў. Мне раней прынеслі, на кухню паставілі кавалачкі, пяць сартоў гэтых кавуноў. Я вызначыў два найлепшыя. Беларускі ўжо нядрэнны. Сёння наогул нічым не адрозніваецца наш кавун ад таго, што мне Эмамалі Шарыпавіч Рахмон даслаў (Прэзідэнт Таджыкістана. — **«Зв.»**). І спецыялісты кажуць, што гэта нават больш карыснае для нас», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што такі ж падыход у яго і ў дачыненні да новых відаў бульбы.

«Потым збіраю ўраджай і гляджу вынік. Бульба, якую нашы вучоныя выводзяць, — насенне (суперэліту я высяваю) — яна нават на смак іншая. Па-першае, яна чыстая — у першы раз высяваецца, яшчэ не набрала ўсякай заразы, па тэхналогіі правільна вырошчваецца. І вось такім чынам я назіраю, што навукоўцы даюць вытворцам», — расказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама падкрэсліваў, што на яго ферме самае лепшае малако. «Вядома, там 13 кароў. Яна ж не вялізная. Але гэта самае чыстае малако, — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка. — Гэта значыць я эксперыментую, гляджу, што трэба. Таму што карміць людзей — гэта пытанне нумар адзін».

Марыя ДАДАЛКА,

Лагойскі раён.

Каментарый у тэму

«Сёння ў Беларусі працуе больш за сем тысяч камбайнаў. Па нашых разліках, практычна кожны год трэба абнаўляць 600-650 камбайнаў. Сёлета мы ўжо паставілі для прадпрыемстваў краіны 350 камбайнаў. Да канца года той нарматыў, які патрабуецца сельскай гаспадарцы, пастараемся выканаць», — сказаў **міністр прамысловасці Пётр ПАРХОМЧЫК**.

Па словах міністра, беларускім прадпрыемствам пастаўляецца 25–30 % усіх камбайнаў, што вырабляюцца ў краіне. Астатняя тэхніка ідзе на экспарт, асноўныя рынкі збыту — Расія, Казахстан, Украіна.

«Імпартазамяшчэнне — штодзённая работа, якой займаемся не адно дзесяцігоддзе. Калі ствараліся новыя ўзоры, мы выкарыстоўвалі ў асноўным кампаненты замежных вытворцаў. Потым ставілася мэта дадзеныя кампаненты лакалізаваць і ствараць свае прадпрыемствы», — дадаў міністр прамысловасці.

Як сцвярджае Пётр Пархомчык, лакалізацыя камбайнаў сёння ў сярэднім складае 53 %. Калі не браць пад увагу метал, што набываем у Расіі, яна паднімецца да 68–70 %.

«Гэта вельмі высокі ўзровень. Калі так падысці да любой вытворчасці, то гэта верхні рубеж, які неабходна дасягаць пры лакалізацыі вытворчасці», — рэзюмуе кіраўнік ведамства.

Ігар ПЕТРЫШЭНКА:

«РАМОНТ АБ'ЕКТАЎ ДА ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА Ў КАПЫЛІ ЗАВЕРШАЦЬ У ТЭРМІН»

Рамонт аб'ектаў да Дня беларускага пісьменства ў Капылі павінны завяршыць своечасова, да свята. Такім меркаваннем з журналістамі падзяліўся намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка ў час рабочай паездкі ў Капыль, перадае карэспандэнт БелТА.

На сустрэчы Ігар Петрышэнка сумесна з мясцовымі ўладамі агледзеў аб'екты, якія будуць задзейнічаны падчас Дня беларускага пісьменства ў Капылі. Імі сталі мясцовы райвыканкам, будынак загса, раённы краязнаўчы музей, гасцініца «Беларусачка», рэстаран «Колас», плошча Леніна, дзе будуць размешчаны розныя забаўляльныя і інтэрактыўныя пляцоўкі, месца адкрыцця памятнага знака «Майстар-гарбар» у гонар беларускага пісьменніка Цішкі Гартнага і закладзеная нядаўна Алея пісьменнікаў.

«Правядзенне Дня беларускага пісьменства стала добрай традыцыяй для нашай краіны. Прымаць такое свята — велізарны гонар для Капыля, асабліва ў значны для краіны Год народнага адзінства. Горад абраны не проста так, тут нарадзілася шмат знакамітых беларускіх пісьменнікаў, якім прысвечана некалькі аб'ектаў. Упэўнены, што ўсе падрыхтоўчыя работы па стварэнні інфраструктуры і святочных лакацый будуць завершаны ў тэрмін», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Ён таксама адзначыў, што правядзенне падобных буйных свят — нагода для мясцовых улад палепшыць знешні выгляд горада, абнавіць інфраструктуру, павысіць якасць жыцця насельніцтва. «Дзень беларускага пісьменства дазваляе рабіць гарады больш утульнымі, папулярызаваць беларускіх пісьменнікаў, іх творы і ў цэлым культуру. Усё, што фарміруе светапогляд і дае глыбінныя веды», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

Падчас маніторынгу правядзення рамонтных работ да свята Ігар Петрышэнка адзначыў шэраг недахопаў, сярод якіх — выбоіны на некаторых участках сцяжынак па вуліцы Леніна, неахайны выгляд агароджы з каменю, хібы пры рамонце будынкаў і іншае. Ліквідацыя дэфектаў узята на кантроль.

Пры падрыхтоўцы да свята ў Капылі была запланавана рэалізацыя некаторых праектаў, якія прысвечаны беларускім пісьменнікам. Напрыклад, на фасадах жылых аб'ектаў у горадзе з'явіліся муралы ў гонар Адама Русака, Алеся Адамовіча і Кузьмы Чорнага.

Побач з раённым краязнаўчым музеем у горадзе ўстанавілі помнік Цішку Гартнаму, а ў гарадскім скверы ўладкавалі Алею пісьменнікаў. Там з'явілася 17 інтэрактыўных лавак з інфармацыяй пра пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў Капыльскім рэгіёне. Для кожнага аб'екта зрабілі ўнікальны QR-код. Адсканіраваўшы

Фота БелТА.

яго, можна будзе атрымаць доступ да біяграфіі літаратара і пазнаёміцца з творамі, якія ён напісаў.

Акрамя таго, у горадзе да свята адрамантуюць аб'екты раённага Цэнтра культуры і краязнаўчага музея, адкрыюць новы будынак дзіцячай бібліятэкі, дзе абсталююць сучасную кінавідэазалу на 30 месцаў з 3D-гукам.

Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў Капылі 5 верасня. Тут жа адбудзецца і рэгіянальнае свята «Дажынкі-2021» — 18 верасня.

Меркаванне

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Васіль ДЗЕМІДОВІЧ:

«Гэта не проста палітыка, гэта наша жыццё»

У вышэйшым заканадаўчым органе краіны Васіль ДЗЕМІДОВІЧ прадстаўляе выбаршчыкаў Кобрынскай акругі № 12. Васіль Мікалаевіч нарадзіўся і вырас у Бярозаўскім раёне, шмат гадоў працаваў у сістэме адукацыі, у парламент абраны з пасады дырэктара Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Як чалавек, які добра ведае моладзь і аддае асаблівую ўвагу пытанням яе асветы, у тым ліку палітычнай, Васіль Дземідовіч лічыць асабліва важным на цяперашнім этапе гаварыць пра жыццёвую неабходнасць народнага адзінства і спрыяць працэсу з'яднання:

— Вякамі ў нашай краіне побач жывуць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, рэлігій і культур. Такая разнастайнасць даўно стала візітоўкай Беларусі, яе ўнікальнай спадчынай, бясцэнным дарам продкаў, які трэба абавязкова захаваць дзеля міру і згоды ў грамадстве, дабрабыту будучых пакаленняў. Гэта задача набывае асаблівую важнасць ва ўмовах глабалізацыі, няспынных інфармацыйных войнаў, часам і гарачых, эканамічных, палітычных і сацыяльных выклікаў. Маладая беларуская суверэнная дзяржава аказалася на скрыжаванні ўказаных падзей.

Людзі, асабліва маладыя, павінны разумець, што ключавым прынцыпам сёння становіцца не нанесці шкоду дзяржаве. І любая дзейнасць — грамадская, палітычная — побач з безумоўным захаваннем закона павінна суадносіцца з вектарам дзяржаўнай палітыкі. У людзей могуць быць розныя меркаванні, але заклікі да дзеянняў, якія накіраваны супраць краіны і курсу, што адобрыла большасць, недапушчальныя.

На сустрэчах з выбаршчыкамі я падкрэсліваю, што пад лозунгам «Беларусь — у Еўропу» часта хаваецца спроба растварэння нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці шляхам прапаганды нібыта еўрапейскіх каштоўнасцяў. А з іншага боку ажыццяўляюцца ўкіды правакацыйнай інфармацыі найбольш дэструктыўнымі сіламі, у тым ліку ў Расіі, аб штучнасці беларускай дзяржаўнасці. І адно, і другое накіравана не на кансалідацыю грамадства, а на яго раз'яднанне.

А вось гэтага дапусціць нельга. Сістэма, якая дазваляе забяспечыць адзінства грамадства, мацуецца сталымі каштоўнасцямі беларускага народа. Гэта, напрыклад, Вялікая Перамога, а таксама ідэя сацыяльнай справядлівасці, увасобленая ў традыцыйнай народнай маралі, этыцы і культуры. Пералічанае і спрыяе захаванню міру, згоды, стабільнасці ў грамадстве.

Наш народ выпакутаваў мір і спакой, таму і цэніць іх асабліва. Для нас вельмі шмат азначаюць паняцці суверэнітэту, незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. І гэта не проста палітыка, гэта наша жыццё, жыццё нашых бацькоў цяпер і нашых дзяцей у будучым.

17 верасня ў нашай краіне ўпершыню будзе адзначацца Дзень народнага адзінства як дзяржаўнае свята. З часам, упэўнены, свята набудзе свой нацыянальны каларыт, свае традыцыі. А цяпер мы павінны правесці яго на дастойным узроўні, згадаць гісторыю, нагадаць, як 17 верасня 1939 года Беларусь змагла нарэшце аб'яднацца. Веданне і шанаванне гэтага патрэбнае найперш для таго, каб больш нас супраць нашай волі ніколі не дзялілі.

Сёння не ўсе народы на планеце могуць пахваліцца нацыянальным адзінствам і ўласным суверэнітэтам. А ў нас яны ёсць, мы павінны гэтым ганарыцца і захаваць гэту найвялікшую каштоўнасць.

Запісала Святлана ЯСКЕВІЧ.

Замацуйце рамяні

БЯСПЕКА ДЗЯЦЕЙ НА ДАРОГАХ — ВАЖНЕЙШАЯ ЗА ЎСЁ

За сем месяцаў года на дарогах Беларусі загінулі 17 непаўналетніх, 267 атрымалі траўмы. Аб гэтым расказала старшы інспектар па асабліва даручэннях галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Ганна БАНАДЫК.

— Надыходзіць вельмі няпросты час як для бацькоў, так і для работнікаў школ і міліцыі. Паступова дзеці вяртаюцца ў гарады з месцаў адпачынку, сельскай мясцовасці. І тут, у гарадскім асяроддзі, яны нярэдка трапляюць у небяспечныя сітуацыі. У летнюю пару адбылося дастаткова шмат непрыемных, часам трагічных сітуацый. За гэтыя канікулы на дарогах краіны загінулі дзесяць дзяцей, з іх восем былі пасажырамі, двое — пешаходамі. Яшчэ 119 дзяцей атрымалі траўмы. Неспрыяльная абстаноўка з дзіцячым дарожна-транспартным траўматызмам складваецца ў Гродзенскай вобласці, дзе загінулі пяць дзяцей: чатыры пасажыры і адзін пешаход. У Віцебскай вобласці за сем месяцаў загінулі тры пасажыры і адзін пешаход; у Магілёўскай вобласці — двое дзяцей: пасажыр і веласіпедыст; у Брэсцкай — пасажыр і пешаход; у Гомельскай — два непаўналетнія пешаходы. У Мінскай вобласці і сталіцы загінулі два дзіцяці-пасажыра.

Актуальным пытаннем з'яўляецца бяспека дзяцей-пасажыраў. «Традыцыйна ў дарожна-транспартных здарэннях з удзелам непаўналетніх, большая частка ўдзельнікаў — гэта дзеці-пешаходы, але ў бягучым годзе сітуацыя змянілася. Цяпер найбольшая колькасць дзяцей, якія трапляюць у ДТЗ, гэта дзеці-пасажыры (41 працэнт). Пры гэтым у кожным другім выпадку дзіця перавозілася з парушэннем правілаў. Таксама з 92 дзяцей-пешаходаў, якія трапілі ў ДТЗ, за сем месяцаў 63 з іх атрымалі траўмы па віне кіроўцаў, 40 — на пешаходных пераходах».

З 25 жніўня да 5 верасня ў краіне праходзіць спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага — дзеці!», паведаміла Ганна Банадык.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Алімпійскі дзённік

У Ігара Бокія — першы медаль Параалімпійскіх гульняў — 2020!

Параалімпіяда для беларускіх спартсменаў пачынаецца паспяхова. А калі ўлічыць, што адкрылі спаборніцтвы галоўныя медальныя надзеі нашай каманды, вера ў іх поспехі толькі ўзрастае. І яны не падвялі.

ПЛАВАННЕ. У першы дзень Гульняў у спаборніцтвах па плаванні на дыстанцыі 100 метраў батэрфляем у класе S13 выступалі Ігар Бокій, Дзмітрый Салей і Уладзімір Сотнікаў. Ігар Бокій па прынцыпе «прыйшоў, убачыў, перамог» стаў чэмпіёнам у сваім першым фінальным заплыве. Да фінішу ён прыплыў за 53,80 секунды. Гэта новы рэкорд Параалімпіяды ў дадзеным відзе праграмы. А для Ігара гэта 12-е «золата» Параалімпійскіх гульняў. Дзмітрый Салей размясціўся на 6-й пазіцыі.

Аляксей Талай у катэгорыі S1 у фінале дыстанцыі 100 метраў на спіне фінішаваў сёмы. Яго вынік — 4 хв. 01.23. Напярэдзе ў Аляксея выступленні на дыстанцыях 150 метраў комплексам, 200 метраў вольным стылем, 50 метраў брасам і на спіне.

ЦІКАВЫ ФАКТ. Параалімпійскае плаванне — другі від спорту па колькасці ўдзельнікаў у Токіа. На першым месцы — лёгкая атлетыка, на трэцім — настольны тэніс. У японскіх басейнах падчас Гульняў выступяць 620 спартсменаў са 100 краін. Усяго будзе разыграна 146 камплектаў медалёў. Для параўнання, на першых афіцыйных Параалімпійскіх гульнях 1960 года ў Рыме плыўцы з 15 краін разыгралі 62 камплекты медалёў.

ФЕХТАВАННЕ. Андрэй Праневіч у фехтаванні на інвалідных каляска пераадолеў кваліфікацыю ў спаборніцтвах на шаблях. Але ў паядынку 1/8 фіналу ён уступіў грэку Панаёцісу Трыантафілу з вынікам 7:15 і выбыў з далейшай барацьбы. Напярэдзе ў Андрэя Праневіча — спаборніцтвы на шпагах.

ЦІКАВЫ ФАКТ. Мэта фехтавання на інвалідных калясках — нанясенне ўдараў ці дотыкаў праціўніку. Пэўная колькасць удараў (звычайна ад 5 да 15) складае схватку. Перамагае той, хто першы набірае патрэбную колькасць балаў. Дотыкі рэгіструюцца электронным чынам з дапамогай спецыяльных датчыкаў і выключаюцца каляровым святлом на баку фехтавальшчыка, які выканаў дотык. У фехтаванні на інвалідных калясках выкарыстоўваюцца тры віды зброі: шабля, шпага і рапіра.

Валерыя СЦЯЦКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Віцэ-прэзідэнт Афганістана назваў прычыны падзення ўрада

Ціск на Кабул з Вашынгтона, фактычнае прызнанне талібаў на перагаворах у Катары і адсутнасць актуальнай інфармацыі ва ўрадзе сталі прычынамі падзення адміністрацыі Ашрафа Гані, заявіў віцэ-прэзідэнт Амрула Салех, які абвясціў сябе выконваючым абавязкі прэзідэнта.

«Цалкам відавочна, што талібы ніколі не падвяргаліся ціску; яны выкарыстоўвалі Пакістан у якасці базы падтрымкі. Увесь Пакістан сёння на службе ў «Талібана». А ЗША стымулявалі гэтае супрацоўніцтва — чым больш яны плацілі, тым больш гэта натхняла пакістанцаў аказваць дапамогу «Талібану», — сказаў ён. Галоўная прычына таго, што адбылося, заключаецца ў тым, што ў апошнія два гады рэспубліка падпала пад вялізны ціск з боку нашых амерыканскіх саюзнікаў. Яны шантажыравалі нас і казалі: альбо вы вызваліце зняволеных, альбо мы скароцім вам дапамогу, у тым ліку і ваенную. Мы спыталі: а ці ўпэўненыя вы, што гэтыя людзі, выйшаўшы з турмаў, не апынуцца на перадавой? Іх адказ быў адмоўны, але ўсе тыя апынуліся менавіта на перадавой. Такім чынам, гэта было не вызваленне зняволеных, а прадастаўленне талібам цэлых падраздзяленняў вельмі радыкалізаваных баевікоў», — дадаў віцэ-прэзідэнт Афганістана.

Салех таксама адзначыў, што міжафганскія перагаворы ў Досе фактычна «легітымізавалі талібаў, якія не захавалі вернасць свайму слову».

Немцы высмеялі словы Зяленскага пра «вяртанне» Крыма

Чытачы нямецкага выдання Die Zeit высмеялі словы ўкраінскага прэзідэнта Уладзіміра Зяленскага на саміце «Крымская платформа» пра пачатак «зваротнага адліку» да вяртання Крыма ў склад Украіны.

На іх думку, Кіеў прад'яўляе патрабаванні, «не маючы нічога на руках», а Расія ніколі не аддасць свой чарнаморскі порт саюзніку НАТА. Цытаты жыхароў Германіі, якія раскрытыкавалі заявы Зяленскага, апублікаваныя ў каментарыях да матэрыялу Die Zeit у Twitter.

Аднаго з чытачоў зацікавіў лёс насельніцтва Крыма. «Гаворачы аб правах чалавека, як жа Зяленскі збіраецца абысціся з насельніцтвам Крыма пасля магчымага вяртання? Яно цяпер даволі выразна адносіць сябе да Расіі», — звярнуўся да ўкраінскага прэзідэнта карыстальнік Bernd Schullcke.

«Патрабаваць, не маючы нічога на руках. Да таго ж у адносінах да такой краіны, як Расія. Зяленскі жыве ў свеце мрояў?» — даў крытычны водгук яшчэ адзін чытач.

23 жніўня на адкрыцці міжнароднага саміту «Крымская платформа» У. Зяленскі заявіў, што пачынаецца «зваротны адлік» да вяртання Крыма ў склад украінскіх тэрыторый. Ён адзначыў, што Кіеў гатовы прыкласці для гэтага ўсе намаганні і спадзяецца на дапамогу сваіх замежных партнёраў. Ён таксама запрасіў Расію ўзяць удзел у форуме і «сесці за стол перагавораў».

За 30 гадоў колькасць гіпертонікаў у свеце павялічылася амаль удвая

Колькасць людзей з артэрыяльнай гіпертэнзіяй у свеце вырасла за апошнія 30 гадоў амаль удвая — з 650 млн да 1,28 млрд, паведамляе ТАСС са спасылкай на Сусветную арганізацыю аховы здароўя (САЗ).

САЗ і Імперскі каледж Лондана правялі «першы ўсеабдымны глабальны аналіз тэндэнцый у галіне распаўсюджвання гіпертаніі, яе выяўлення, лячэння і кантролю». Вынікі даследавання апублікаваныя ў медыцынскім часопісе The Lancet. Прааналізаваўшы даныя вымярэнняў крывянога ціску больш за 100 млн жыхароў 184 краін ва ўзросце 30-79 гадоў, вучоныя прыйшлі да высновы, што з 1990 да 2019 года колькасць людзей з артэрыяльнай гіпертэнзіяй вырасла з 650 млн да 1,28 млрд. Як адзначае САЗ, гіпертанія значна павялічвае рызыку хвароб сэрца, мозга і нырак і з'яўляецца адной з асноўных прычын смерці і захворванняў у свеце.

ПЕРШЫЯ ЗВАНКІ І КЛЮЧЫ АД НОВЫХ КВАТЭР

КАЛЕГІ-НАВАСЁЛЫ

Так, у Нароўлі напярэдадні новага навучальнага года дзевяць маладых спецыялістаў-педагогаў атрымала ключы ад кватэр у новым арэндным доме. Сем з іх пакуль не абзавяліся сем'ямі, двое адзначаюць увахадзіны разам з сужэнцамі і малымі дзецьмі.

— Усе яны пажадалі стаць на ўлік, каб палепшыць свае жыллёвыя ўмовы, і менш за год чакалі сваёй чаргі, — растлумачыла **старшыня Нараўлянскай раённай арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза супрацоўнікаў адукацыі і навукі Галіна ЗЯЗЁТКА**. — Атрыманне арэнднага жылля — добрая магчымасць замацавацца па месцы жыхарства, жыць і працаваць у сваёй краіне.

У новых кватэрах усё добраўпарадкавана, можна засяляцца і жыць. Навасёлы-педагогі цяпер завозяць рэчы ў адна-двухпакаёвыя кватэры. Увогуле ж чатырохпавярховік на 40 кватэр пабудаваны па заказе Мазырскага УКБ за грошы дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. За арэнду жылля маладыя спецыялісты будуць плаціць 40 працэнтаў ад поўнай сумы за адпаведную плошчу.

Сярод маладых педагогаў-навасёлаў — тыя, хто прыехаў у Нараўлянскі раён па размеркаванні з суседніх Калінкавіцкага і Мазырскага. Ёсць і тыя, хто сам родам з Нараўляншчыны, тут пачаў сваю прафесійную дзейнасць, тут жа мяркуе і ствараць сваю сям'ю.

Дарэчы, трое маладых спецыялістаў — супрацоўнікі адной навучальнай установы, працуюць у Вербавіцкім дзіцячым садзе — базавай школе. Навасёлы — педагог пачатковых класаў Аліна

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладзіслаў ЦАЛКА, Максім ПІВАВАРАЎ, Галіна ЗЯЗЁТКА, Фаіна ПРЫХОДЗЬКА, Настасся БУРАК, Аліна ШЭРАШ, Настасся ЦІМОШЧАНКА, Валерыя ПЕРАПЕЧА — навасёлы дома ў Нароўлі з «групай падтрымкі».

Шэраш, настаўнік фізікі і інфарматыкі Максім Півавараў і настаўнік хіміі і біялогіі Валерыя Перапеча.

— Я сама родам з Нароўлі, — кажа хімік-біёлаг Валерыя Аляксандраўна. — Год таму скончыла Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна, атрымала размеркаванне ў свой раён.

Педагог шчыра радуецца і свайму вяртанню дадому, працаўладкаванню ў добрай школе, а цяпер яшчэ і новай аднапакаёўцы ў райцэнтры.

— У кватэры вялікая светлая зала — гэта тое, што не можа не падабацца, — дзеліцца настаўніца. — У новую кватэру мару набыць і новую мэблю, тэхніку. Цяпер чакаю дакументы, каб атрымаць крэдыт на спажывецкія тавары як малады спецыяліст.

Ад Нароўлі да аграгарадка Вербавічы восем кіламетраў, на работу з райцэнтра супрацоўнікі дзіцячага сада — базавай школы дабіраюцца на школьным аўтобусе. Пра сваю работу на вёсцы Валерыя Аляксандраўна кажа толькі пазітыўнае.

— Не магу перадаць, як добра праходзіць адаптацыя маладога педагога ў вясковай школе. Самая вялікая колькасць вучняў у класе ў нас сем чалавек, таму вельмі камфортна працаваць.

Сярод навасёлаў — Наталля Пугач. Педагог дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці ў Нароўлі з сям'ёй стаяла ў чарзе на кватэру менш чым год.

— Мы з мужам самі з Брагінскага раёна. Я скончыла Лоеўскі дзяржаўны педагагічны каледж, па размеркаванні атрымала накіраванне на работу ў Нароўлю, завочна паступіла ў Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна, цяпер ужо апошні год вучыцца, — расказвае пра сябе Наталля Віктараўна.

У новай кватэры ў Нароўлі — малады спецыяліст Наталля ПУГАЧ з дачкой Вікторыяй.

Для яе сям'і новая кватэра — асаблівая падзея. Дачка Вікторыя ідзе ў першы клас.

— Мы за адзін дзень перасяліліся са здымнай кватэры ў сваю новую, — кажа маці першаклашкі. — Цяпер марым аб адным — зрабіць у калідоры вялікую ўбудаваную шафу: па планіроўцы проста просіцца, усё зможам змясціць.

СЕМ'І З ХОЙНІКАЎ

Перад пачаткам новага навучальнага года доўгачаканае наваселле ў новых кватэрах будуць сустракаць і сем'і з Хойнікаў. У райцэнтры днямі таксама здадзены новы саракакватэрны жылы дом.

Адна з навасёлаў — мама чацвярых дзяцей Марына Варабей. Хайнічанка падзялілася, што яе сям'я пабудавала кватэру з прыцягненнем дзяржаўнай падтрымкі. Ключы жанчына прыйшла атрымліваць разам з дачкой Ксеніяй і сынам Дзянісам, дзень нараджэння якога супаў з датай здачы дома. Кажуць, выдатны падарунак на свята.

— Мець свой куток у горадзе, які любіш, — вялікае шчасце, — коратка адзначае шматдзетная маці.

Цяпер будучыя суседзі знаёмяцца адзін з адным. Засяляюцца не толькі жыхары райцэнтра. Сям'я Сульжэнкі, у якой таксама чацвёра дзяцей, напрыклад, — з аграгарадка Судкова. Разам з маці Таццянай аглядаць новую кватэру прыехалі трое дзяцей — Паліна, Арцём і Каміла. Арцём па-гаспадарску заўважае: грошай у скарбонку цяпер трэба будзе збіраць больш, бо побач з домам — супермаркет.

БУДУЕЦЦА БРАГІН

На Брагіншчыне сярод шчаслівых уладальнікаў новага вялікага індывідуальнага жылога дома — сям'я Міненка. У Наталлі і Паўла пяцёра дзяцей. Пабудаваць сваё жыллё атрымалася дзякуючы Указу Прэзідэнта № 240 і сямейнаму капіталу.

— Нашаму райвыканкаму шчыры дзякуй! Будаваліся ўпершыню, мала што ведалі: куды звяртацца, каго наймаць, як афармляць дакументы. Усё гэта дапамагалі вырашыць супрацоўнікі райвыканкама, вельмі дапамаглі і на прыёмцы дома, — падзяліўся шматдзетны бацька Павел Міненка.

Прынамсі, апошнія гады ў раёне — будаўнічы бум: узводзяцца індывідуальныя жылыя дамы, арэнднае жыллё, будуюцца кватэры з дзяржаўнай падтрымкай. Толькі ў 2018-м у Брагіне было ўведзена больш за дваццаць індывідуальных жылых дамоў, 24-кватэрны жылы дом, пабудаваны за «чарнобыльскія» сродкі, і яшчэ адзін, аналагічны, за кошт абласнога бюджэту. У аграгарадку Мікулічы пабудаваны аднакватэрны жылы дом больш чым на 140 «квадратаў» для шматдзетнай сям'і. У 2019-м з'явіўся шматкватэрны жылы дом у райцэнтры, у якім 30 кватэр пабудаваныя з дзяржаўнай падтрымкай (Указ № 240) і дзесяць — з бюджэтным фінансаваннем (арэнднае жыллё). Летась ключы ад новых кватэр атрымалі жыхары гарадскога пасёлка Камарын, дзе ўведзены 48-кватэрны жылы дом. Ужо сёлета ў Брагіне пабудавана звыш дзвюх з паловай тысяч квадратных метраў жылля. Гэта амаль 85 працэнтаў ад гадавога задання.

Новы дом шматдзетнай сям'і Міненкаў з Брагіна.

За лічбамі і «квадратамі» — лёсы рэальных людзей, якія абралі жыццё ў раёнах, вяртаюцца дадому і знаходзяць тут сваё шчасце.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Крымінал, здарэнні

ПРАДАЎ ЧУЖЫ САМАКАТ ЗА 10 РУБЛЁЎ

Насамрэч украдзеная маёмасць каштавала 1300

У аператыўна-дзяжурную службу Ленінскага РАУС Магілёва з заявай звярнуўся 35-гадовы мясцовы жыхар, які распавёў, што застаўся без электрычнага самаката коштам 1300 рублёў. Інцыдэнт адбыўся ў начны час: транспартны сродак знаходзіўся каля аднаго з дамоў па вуліцы Якубоўскага.

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку высветлілі, што чужы самакат забраў 58-гадовы мужчына, які гуляў па начным горадзе. А раніцай прадаў на адным з рынкаў горада даверліваму пакупніку. Апошні забраў сродак перамяшчэння за 10 рублёў, нават не пацікавіўшыся, як яго зараджаць. «Прадавец» запэўніў пакупніка: гэта яго асабістая маёмасць, на якой прыемна і зручна перасоўвацца па горадзе. Атрыманыя ад продажу грошы мужчына адразу ж выдаткаваў на куплю спіртных напояў.

Цяпер украдзены самакат вернуты ўдзячнаму ўладальніку. У дачыненні да падазраванага распачата крымінальная справа, следчымі дадзена прававая ацэнка.

Як заўважылі ва УУС Магілёўскага аблвыканкама, найбольш уразлівыя месцы для страты самаката — паркоўкі, размешчаныя паблізу жылога масіву. На цэнтральных вуліцах горада такія крадзяжы — хутчэй рэдкасць, бо на адкрытай мясцовасці прасачыць маршрут парушальніка закона з дапамогай GPS-датчыка не складзе вялікай цяжкасці. Аднак людзі часам бачаць на паркоўцы сродак перамяшчэння і проста забіраюць яго дадому, не думаючы, што яго лёгка можна знайсці па трэкеры. Самакат перадае гукавы сігнал, яго бачыць уладальнік і накіроўваецца на пошукі.

Да таго ж украдзеная маёмасць бескарысная без прывязкі да сервера — ён проста не будзе працаваць, але людзям, якія плануюць перапрадаць чужы самакат даверлівым грамадзянам, гэта не важна: для іх галоўнае — збыць яго з рук і атрымаць грошы.

МАРУСЯ ЗНАЙШЛАСЯ

Жыхар Барысаўскага раёна хацеў зарабіць грошай на продажы крадзенага каня, а зарабіў тэрмін.

Аб прапажы жывёліны ў аператыўна-дзяжурную службу Загараднага аддзела міліцыі Барысаўскага РУУС паведаміў яе гаспадар, 47-гадовы жыхар вёскі Зачысце. Мужчына распавёў, што невядомыя ўкралі з пашы ўлюбёнку — 7-гадовую кабылу па мянушцы Маруся.

У ходзе комплексу аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікам аддзела крымінальнага вышуку ўдалося аднавіць падзеі таго дня і выйсці спачатку на пакупніка, а затым і на зламысніка.

Выкрадальнікам, як паведамляе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Барысаўскага РУУС, аказаўся 18-гадовы мясцовы жыхар. Малады чалавек жыў побач, таму неаднаразова камунікаваў з канём. Менавіта з гэтай прычыны яму ўдалося вывесці жывёліну з пашы на ўскраіну вёскі.

Там жа падазраваны стаў вырашаць, каму і за якую суму можна прадаць каня. Разумеючы, што зрабіць гэта трэба ў самыя кароткія тэрміны, з пошукам пакупніка цягнуць не стаў. І ўжо раніцай наступнага дня прадаў жывёліну жывой вагой жыхару Магілёва за сімвалічную суму ў 780 рублёў. Дарэчы, рыначны кошт каня ў некалькі разоў вышэйшы.

Сваю віну падазраваны цалкам прызнаў, а таксама растлумачыў, што такім чынам ён хацеў зарабіць. Заведзена крымінальная справа за крадзеж. Вяскоўцу пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

УЦЁКІ НА САМАРОБНЫМ МАТАЦЫКЛЕ

Кіроўца быў нападпітку — 1,5 праміле

Недалёка ад вёскі Сідараўка Магілёўскага раёна інспектары ДАІ звярнулі ўвагу на незвычайны мотатранспарт, які рухаўся па дарозе. Сігнал спыніцца кіроўца праігнараваў і працягнуў рух, у выніку завязалася пагоня.

Як паведамляе падрабязнасці УУС Магілёўскага аблвыканкама, спрабуючы ўцячы, кіроўца павярнуў на поле, аднак у самы нязручны момант самаробная тэхніка яго падвяла — у ёй скончыўся бензін. Не трацячы надзеі сысці ад адказнасці, мужчына кінуўся наўцёкі. Прабежка ад інспектараў таксама скончылася няўдала — кіроўца быў затрыманы.

Пры далейшым разглядзе высветлілася, што 42-гадовы вясковец бег ад ДАІ з шэрагу прычын: ён раней быў пазбаўлены правоў за нецвярозую паездку, яго самаробны матацыкл, зразумела, не зарэгістраваны ў ДАІ. Акрамя таго, ехаў ён нападпітку (па выніках агляду — 1,5 праміле) за «дазапраўкай» у найбліжэйшую краму.

За бяспраўную нецвярозую паездку, што пацягнула пераслед, мужчыну цяпер пагражае вялікі штраф і далейшае пазбаўленне права кіравання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАТРЭБНАЕ НЕПАТРЭБНАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З падобнымі гісторыямі час ад часу даводзіцца сутыкацца, кажуць нарыхтоўшчыкі.

— Хтосьці ў кагосьці крадзе, здае нам... Справу перадаюць у следчы камітэт. Праваахоўнікі прыязджаюць і канфіскуюць крадзенае, а шкоду мы кампенсуем праз суд. Гэта значыць, судзімся з тым, хто скраў.

Праўда, кампенсаваць шкоду атрымліваецца не заўсёды.

— Калі гэта алкаголік, які нідзе не працуе, то ў яго няма маёмасці і няма чаго апісваць. Гэта нашы прафесійныя рызыкі: прымаючы другасную сыравіну, нарыхтоўшчык нічога не ведае пра яе паходжанне.

«У кожнага свая жыццёвая гісторыя, многія прыходзяць не толькі здаць другасную сыравіну, але і пагаварыць. І трэба да кожнага паставіцца добразычліва і ўважліва».

Прынята лічыць, што другасная сыравіна — гэта «хлеб» алкаголікаў, перманентна беспрацоўных, бяздомных і іншых людзей, што згубіліся ў гэтым жыцці. На самай справе, аматары выпіць «пладова-выгаднага» і асобы без пэўнага месца жыхарства — гэта працэнтаў 20 сталых пастаўшчыкоў другаснай сыравіны ў прыёмныя пункты, распавядае суразмоўца. У процівагу распаўсюджанаму меркаванню такія людзі часцей за ўсё сумленныя і не падманваюць нарыхтоўшчыка. Здача другаснай сыравіны — іх пастаянны артыкул даходу, і калі яны падмануць адзін раз, у другі з імі ніхто не стане мець справу.

— Сярод тых, хто здае сельгаспрадукцыю і дары лесу, няма ні бяздомных, ні ахвяр зялёнага змея. Бо для таго, каб здаць агародніну, садавіну, грыбы ці ягады, трэба папрацаваць. Сметнік растрыбушыць прасцей, — кажа суразмоўца.

Асобы без пэўнага месца жыхарства займаюцца другаснай сыравінай — часцей за ўсё гэта макулатура і шклабой, распавялі ў прыёмным пункце горада Баранавічы.

ПАЧЫМ МЕТАЛАЛОМ?

Гена, «пастаянны кліент» пункта прыёму другаснай сыравіны на ўскраіне Мінска, спецыялізуецца ў асноўным на шклабоі. Сваю гісторыю ён ахвотна распавядае кожнаму, хто гатовы слухаць. Што праўда, а што выдумка ў ёй, сказаць цяжка: супрацоўнікі прыёмнага пункта кажуць, што кожны раз гісторыя трохі новая. Але нязменна ёсць у ёй цяжкае дзяцінства, фінансавы ўзлёт у 1990-я і доўгія гады без даху над галавой.

— Любая шкляная тара здаецца па 20 капеек за кг, калі гэта белае шкло. Аконнае шкло таксама прымаюць па такой цане. Каляровае шкло можна здаць па 14 капеек за кілаграм. Раней, у маёй маладосці, ад шампанскага бутэлькі не прымалі і яшчэ шмат якія. А цяпер любыя ідуць на вагу. І каньячныя таксама. Можна нямытыя нават. Праўда, некаторыя бутэлькі прымаюцца, як і раней, паштучна — з-пад віна і лікёру. Але іх трэба чыста мыць. А вось анучы ўжо не прымаюць пяць гадоў, — сумуе Гена.

Метал гэты «кантынгент» здае радзей. Дарэчы, у прыёмныя пункты другаснай сыравіны ўвогуле можна здаць паперу і кардон, шклабой, метал, поліэтылен, акумулятары. Металалом сёння здаваць выгадна — ён каштуе 61 капейку за кілаграм. Звычайна, распавялі мне ў прыёмна-нарыхтоўчым пункце Баранавіцкага райпо, аматары выпіць і асобы без пэўнага месца жыхарства прывозяць «мікрапартыі» — на тачках, у старых дзіцячых калясках.

— Назбіралі 20—30 кілаграмаў, здалі — пайшлі пахмяліліся... Раней металалом падзялялі на чорны метал, сталь і чыгун, — расказалі ў прыёмна-нарыхтоўчым пункце Баранавіцкага райпо. — Цяпер (з 1 жніўня гэтага года) ад насельніцтва прымаюць усё разам, па адной цане. «Белдругчармет» раздзяляе ўсё сам. Металалом здаваць асабліва выгадна. За апошнія месяцы ён значна вырас у цане: з 20—30 капеек да 61 капейкі за кілаграм. І да таго ж, металалом расце ў цане кожны месяц.

ПРА ЧЫГУННЫЯ ПАТЭЛЬНІ

«У дзень у нас часам бывае 30 чалавек і нават болей», — кажа Тамара. Яе працоўнае месца — невялікая металічная будка каля Мінскай кальцавой. У сістэме нарыхтоўкі мая суразмоўніца працуе ўжо 20 гадоў. Кажа, ёй падабаецца: з людзьмі працаваць заўсёды цікава. Публіка, вядома, тут няпростая, але галоўнае — не дапускаць канфліктаў.

— Як правіла, асноўны наплыў наведвальнікаў — у 9 раніцы, адразу пасля адкрыцця, і потым пасля чатырох гадзін дня, бліжэй да вечара. «Чорны спіс»? Ёсць такі, — смяецца суразмоўніца. — Я яго ў галаве трымаю. І пастаянных кліентаў таксама ў твар і па імёнах памятаю. Мая праца — гэта зносіны з людзьмі. У кожнага свая жыццёвая гісторыя, многія прыходзяць не толькі здаць другасную сыравіну, але і пагаварыць. І трэба да кожнага паставіцца добразычліва і ўважліва, а то ж сыдуць у іншыя прыёмныя пункты. Таму клапачуся аб тым, каб заўсёды ў наяўнасці было дастаткова дробязі — аддаць кліенту ўсё да капейкі. Бо для многіх з іх нават тры-пяць капеек — гэта грошы.

«Пастаянныя кліенты» прыёмных пунктаў — не толькі вышэйпералічаныя асобы са складаным лёсам. Дастаткова і пенсіянераў, кажа Тамара. Для заядлых дачнікаў збор другаснай сыравіны можа стаць нядрэннай крыніцай даходу, асабліва калі ў сям'і ёсць машына.

Аксана Аркадзеўна і Антон Глебавіч — пенсіянеры. Вось ужо пяць гадоў бязвылазна жывуць ва ўласным доме пад Мінскам, у горад выбіраюцца нячаста. У лес муж і жонка ходзяць не толькі ў грыбы і ягады, але і па старыя «жалязякі». Вакол іх вёскі — дачныя таварыствы, і на звалках каля дач аказваецца шмат усялякай усячыны.

Здаваць сабранае на старэнькай «Ніве» пенсіянеры ездзяць у Мінск, у прыёмны пункт каля МКАД. Ехаць ім — 40 хвілін.

— І лясы становяцца чысцейшыя, і прыбаўка да пенсіі. Іншая справа, што апошнім часам лясы ачысціліся і без нас. Металалом цяпер у цане, і «безгаспадарнага» металу практычна не засталося. Людзі ўсё падабралі і вывезлі.

Дарэчы, часам людзі прыязджаюць у прыёмны пункт не толькі здаць другасную сыравіну. Тут здараюцца сапраўдныя гістарычныя знаходкі.

— Мы не гандлёвая арганізацыя, і прадаваць тое, што нам прынеслі, не маем права, — тлумачыць Сяргей, супрацоўнік аднаго з мінскіх пунктаў прыёму другаснай сыравіны. — Але зрэдку можам пайсці насустрач кліенту і памяняць, напрыклад, жалеза на жалеза. Гэта законна. Вам спадабаўся нейкі кавалак металу, вы прынеслі іншы такі ж, той жа вагі — і мы памянялі.

Так што часам замест грошай у абмен на здадзеную другасную сыравіну людзі просяць узяць «рарытэты».

— Часам трапляюцца дзіўныя рэчы, — кажа Антон Глебавіч. — Напрыклад, чыгунныя патэльні. Зараз такіх, напэўна, ужо не робяць. А, між тым, ніякія сучасныя антыпрыгарныя пакрыцці не параўнаюцца з сапраўднай, цяжкай, савецкага ўзору чыгуннай патэльняй. На ёй ніколі нічога не прыгарае, усё прасмажваецца раўнамерна. Сучасную патэльню праз пару гадоў выкідваеш, а чыгунная — яна ж вечная! Мы самі гатуем толькі на ёй, і дачцэ падарылі, каб яна змагла ацаніць, як на ёй цудоўна гатаваць. Яшчэ нядаўна знайшлі прас — старадаўні, у які вуглі трэба насыпаць. У маёй бабулі такі быў, я яго памятаю з дзяцінства. Мы ім не карыстаемся, вядома, ён проста ў нас стаіць — рэч цікавая.

— Чыгунныя патэльні вельмі рэдка здаюць, — тлумачыць Сяргей. — Самавары, старажытныя прасы — вельмі рэдка. За чатыры гады ўсяго шэсць штук самавараў прынеслі. Памятаю, былі дзве старадаўнія сячкарні для травы. А ўчора вось здалі савецкую каску СШ-40, узору 1940 года.

Тое ж самае кажа і калега Сяргея з іншага раёна сталіцы, Тамара:

— Ці трапляюцца старадаўнія рэчы? Наогул, вельмі рэдка. Бывае, нясуць самавары, але не надта старыя, гадоў 1970-х. Неяк здалі старыя гіры. Часам да нас трапляюць кнігі з аўтографамі пісьменнікаў, нават знакамітых.

ЗРАБІЦЬ СВЕТ ЛЕПШЫМ

Маладых людзей Крысціну і Стаса ў прыёмны пункт прывялі зусім не меркантыльныя меркаванні.

— Летам вырашылі пажыць у Стаса на лецішчы, і захацелася дапамагчы прыродзе, зрабіць навакольнае асяроддзе чысцейшым. Бо калі кожны ўнясе свой пасільны ўклад у нейкую добрую справу, аб'ектыўна жыццё стане лепшым. Там на дачным сметніку столькі барахла сабралася! Мы на сваёй машыне возім — не спецыяльна ездзім, а толькі калі ў Мінск трэба па справах. Пакрысе, але ўжо дачны сметнік амаль разгрузілі. Там жа і старыя халадзільнікі, і поліэтылен, і шыны, і нават старыя аўтамабільныя акумулятары. А атрыманыя грошы або пералічваем прытулку для жывёл, або на рахункі дзяцей, якім патрэбныя ахвяраванні. Ну і сёе-тое ідзе на рамонт у нашай «аднапакаёўцы», — распавядае Крысціна.

«А, між тым, ніякія сучасныя антыпрыгарныя пакрыцці не параўнаюцца з сапраўднай, цяжкай, савецкага ўзору чыгуннай патэльняй. На ёй ніколі нічога не прыгарае».

Мае суразмоўнікі — студэнты, плануюць ажаніцца пасля заканчэння вучобы.

— Я нядаўна прачытаў, што тона макулатуры, напрыклад, эканоміць каля чатырох квадратных метраў драўніны, — дадае Стас. — І што з другаснай сыравіны вырабляюць больш за тысячу найменняў патрэбных рэчаў.

Дарэчы, пра макулатуру. Памятаецца, у нашым дзяцінстве яе актыўна збіралі школьнікі. Цяпер, распавялі нарыхтоўшчыкі, дзеці таксама збіраюць макулатуру — у сярэднім два-тры разы за вучэбны год. Прымаюць паперу і кардон сёння па 20—25 капеек за кілаграм.

— Кардонная ўпакоўка цяпер паўсюдна ўваходзіць у цану тавару, — адзначае Сяргей. — І гэтую кардонную тару здаюць як другасную сыравіну і людзі, і прадпрыемствы. «Еўраопт», напрыклад, прэсуе адразу па пяць тон і потым вывозіць кардон цэлымі кантэйнерамі.

Людзі ж, у асноўным, прыносяць кнігі — цяпер у інтэрнэце можна знайсці практычна любы тэкст, і многія вырашаюць пазбавіцца ад папяровых кніг, якія збіраюць пыл і займаюць шмат месца.

Дзіяна РОНІНА.

Будзь у курсе!

ЯШЧЭ АДЗІН ЦЯГНІК У РАСІЮ

З 1 верасня аднаўляе курсіраванне яшчэ адзін цягнік паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Так, у штодзённы абарот прызначаецца састаў № 28/27 Брэст — Масква фарміравання Беларускай чыгункі. Цягнік будзе ісці праз станцыю «Баранавічы-Палескія».

Як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, у першы рэйс цягнік адправіцца з Брэста 1 верасня ў 18.23 і прыбудзе ў сталіцу Расійскай Федэрацыі ў 9.23 наступных сутак. З Масквы цягнік будзе адпраўляцца з 2 верасня ў 23.30 і прыбываць у Брэст у 14.46 наступных сутак.

Звяртаем увагу, што праезд цягнікамі, якія курсіруюць у Расію, прадугледжаны толькі для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Нагадваем, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія едуць у суседнюю краіну чыгуначным транспартам, абавязаны пацвердзіць наяўнасць адмоўнага выніку лабараторнага даследавання на інфекцыю COVID-19, выкананага не пазней чым за трое сутак да даты перасячэння граніцы, з выкарыстаннем мабільнай праграмы «Падарожнічаю без COVID-19», а таксама выконваць масачны рэжым пры знаходжанні на чыгуначных вакзалах і ў цягніках.

У цяперашні час паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй арганізавана курсіраванне 13 пар міжнародных пасажырскіх цягнікоў па наступных напрамках: Мінск — Масква, Мінск — Адлер, Брэст — Масква, Брэст— Мінск — Санкт-Пецярбург, Гомель — Масква, Полацк — Масква, Гомель — Санкт-Пецярбург, Калінінград — Масква, Калінінград — Санкт-Пецярбург, Калінінград — Адлер.

Беларуская чыгунка будзе аператыўна інфармаваць аб аднаўленні курсіравання іншых пасажырскіх цягнікоў па міжнародных маршрутах.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 16 сентября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение с инв. № 600/С-58070 общей площадью 1109,8 кв. м (наименование – профилакторий, ремонтная мастерская; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание профилактория, ремонтной мастерской); капитальное строение с инв. № 600/С-58066 общей площадью 380,7 кв. м (наименование – материально-технический склад; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание материально-технического склада со сторожевой будкой 1); капитальное строение с инв. № 600/С-57540 общей площадью 793,5 кв. м (наименование – ремонтная мастерская; назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); составные части и принадлежности: одноэтажное здание ремонтной мастерской смешанной конструкции); капитальное строение с инв. № 600/С-58065 общей площадью 576,3 кв. м (наименование – служебно-бытовой корпус; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание служебно-бытового корпуса с подвалом – (А2/к), навесом – 1, двумя асфальтированными площадками – а,б, бетонным забором – в, сеточным ограждением – г); капитальное строение с инв. № 600/С-58062 общей площадью 285,8 кв. м (наименование – мойка автомобильная; назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции); составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание мойки автомобильной Д1/к с пристройкой 1); капитальное строение с инв. № 600/С-58069 общей площадью 1223,1 кв. м (наименование – профилакторий для ремонта машин; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание профилактория для ремонта машин); капитальное строение с инв. № 600/С-58060 общей площадью 665,5 кв. м (наименование – автогараж; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание автогаража); капитальное строение с инв. № 600/С-134227 общей площадью 21,4 кв. м (наименование – контрольно-пропускной пункт; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание контрольно-пропускного пункта с тротуарной дорожкой а, крыльцом); капитальное строение с инв. № 600/С-58058 общей площадью 256,3 кв. м (наименование – служебно-бытовой корпус; назначение – здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: одноэтажный сборно-щитовой служебно-бытовой корпус с пристройкой 1); капитальное строение с инв. № 600/С-168908 общей площадью 42 кв. м (наименование – трансформаторная подстанция; назначение – сооружение специализированное энергетики; составные части и принадлежности: сооружение трансформаторной подстанции); капитальное строение с инв. № 600/С-131147 протяженностью 236 м (наименование – энергосети; назначение – сооружение специализированное энергетики; составные части и принадлежности – энергосети состоящие из участков энергосетей а1, а2, а3, а4, а5); капитальное строение с инв. № 600/С-131146 протяженностью 254,8 м (наименование – тепловые сети; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства; составные части и принадлежности: тепловые сети); капитальное строение с инв. № 600/С-171338 протяженностью 240,6 м (наименование – внутренние сети водопровода; назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения; составные части и принадлежности: сооружение внутренних сетей водопровода); капитальное строение с инв. № 600/С-171337 протяженностью 284,3 м (наименование – внутренние сети канализации; назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства; составные части и принадлежности: сооружение внутренних сетей канализации
Сведения о земельном участке: площадь – 2,3102 га, кадастровый номер – 623681702601001070
Местонахождение – Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Кольцевая, 9А, 9А/1, 9А/2, 9А/3, 9А/4, 9А/5, 9А/6, 9А/7, 9А/8, 9А/9
Начальная цена – 3 444 125,33 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка – 300 000,00 бел. руб.
Обременение – аренда

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **16 сентября 2021 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 27.08.2021 по 14.09.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.
Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 16 сентября 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение (подземное битумохранилище) с инв. № 631/С-59042, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 16.05.2018 года б/н составленному по состоянию на 25.05.2009 года; капитальное строение (водопроводная сеть) с инв. № 631/С-58995, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: водопроводная сеть, протяженностью 175,6 м, состоящая из напорного трубопровода, колодца, артезианской скважины, водонапорной башни; капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 631/С-12108, общей площадью 308,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса, с пристройкой, асфальтно-бетонной площадкой, тремя ограждениями (с воротами и столбами); капитальное строение (гидронохранилище) с инв. № 631/С-59045, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: гидронохранилище объемом 2061 м куб.; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59044, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 948 м куб.; капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59043, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 648 м куб.; капитальное строение (здание весовой, проходной) с инв. № 631/С-12106, общей площадью 81,0 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой, проходной; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58979, общей площадью 110,1 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание склада с пристройкой; капитальное строение (котельная) с инв. № 631/С-12107, общей площадью 102,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной с пристройкой; капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 631/С-58986, общей площадью 57,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции; капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58980, общей площадью 65,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное здание склада; капитальное строение (компрессорная) с инв. № 631/С-58981, общей площадью 81,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание компрессорной с пристройкой, тремя емкостями; капитальное строение (электроцех) с инв. № 631/С-58982, общей площадью 39,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание электроцеха; капитальное строение (паропровод) с инв. № 631/С-58987, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной паропровод, протяженностью 184,8 кв. м, состоящий из двух участков; капитальное строение (битумопровод) с инв. № 631/С-58989, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной, битумопровод диаметром 75 мм, протяженностью – 201 м; капитальное строение (мазутопровод) с инв. № 631/С-58988, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно технического паспорта на сооружение от 16.05.2018 года б\н составленному по состоянию на 16.06.2009 года; капитальное строение (канализационная сеть) с инв. № 631/С-58990, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная канализационная сеть протяженностью 108 м, состоит из двух участков и четырех колодцев; капитальное строение (линия электропередачи) с инв. № 631/С-58992, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная линия электропередачи протяженность 646,6 м, напряжением 04 кВ, состоящая из четырех участков; капитальное строение (линия наружного освещения) с инв. № 631/С-58993, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: линия наружного освещения протяженностью 19,7 кв. м, напряжением 0,4 кВ, способ прокладки – подземный, состоит из двух участков и двух мачт; капитальное строение (сеть газопровода) с инв. № 631/С-65180, общей площадью 259,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно технического паспорта на сооружение от 23.02.2018 года б/н, составленному по состоянию на 22.02.2018 г. Молодечненским филиалом РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; узел учета газа, инвентарный номер 1372; установка докотловой обработки воды, инвентарный номер 940; резервуар Р 2500000, инвентарный номер 402; резервуар Р-25, инвентарный номер 410; емкость металлическая, инвентарный номер 201; трансформатор ТМ 630/10, инвентарный номер 678; емкости, инвентарный номер 657; емкости, инвентарный номер 658; комплект системы управления «Альфа-П» инвентарный номер 670; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 671; котлоагрегат, инвентарный номер 693; котел Е 1/9, инвентарный номер 695; котел чугунный водогрейный, инвентарный номер 712; модуль подогрева топлива БСТ-МПТ-12-2, инвентарный номер 715
Сведения о земельных участках: площадь – 1,5355 га, кадастровый номер – 621350100001000310; площадь – 4,6829 га, кадастровый номер – 621350100004000541
Местонахождение: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Волкова, 43
Начальная цена: 215 241,22 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 21 500,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условие торгов: Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **16 сентября 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 27.08.2021 по 14.09.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам:
(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).
Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ И ПРЕДМЕТЕ АУКЦИОНА

Организатор аукциона: комитет «Минскоблимущество», тел.: (8017) 5004711, 5168054, 5168055.

День и время проведения повторного аукциона: **22 сентября 2021 г. в 11.00.**

Недвижимое имущество:

• незавершенное незаконсервированное капитальное строение с подвалом, готовность 51 %;
• незавершенное незаконсервированное капитальное строение с подвалом, пристройкой и навесом, готовность 69 %,

расположенные по адресу: Минская обл., Минский район, Горанский с/с, район д. Лихачи, д. Новое Поле.

Начальная цена недвижимого имущества: 510 175,78 руб. (*Начальная цена понижена на 50 %).*

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Минского областного исполнительного комитета **www.minsk-region.gov.by** (http://minsk-region.gov.by/dlya_delovykh_lyudey/auktsiony), Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by** (http://gki.gov.by/ru/auction).

УНП 600052360

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

26 ЖНІЎНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15915)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Іван БУСЛАЙ:

«СПЯВАЦЬ ПАЧАЎ РАНЕЙ, ЧЫМ ГАВАРЫЦЬ»

У нашага сённяшняга героя незвычайны лёс. Ён нарадзіўся, як кажа сам, выпадкова, выхоўваўся ў дзіцячым доме, а спяваць пачаў раней, чым гаварыць. Сваю сямейную гісторыю даведаўся толькі, калі стаў знакамітым эстрадным артыстам. Беларус з цыганскай душой — так падчас нашай сустрэчы назваў сябе спявак. У інтэрв'ю з Іванам Буслаем і яго канцэртным дырэктарам Вольгай Макаравай мы пагутарылі аб творчасці, дрэнных звычках, «зорным» псеўданіме, а таксама аб планах вакаліста.

«МАЁ САПРАЎДНАЕ ПРОЗВІШЧА...»

Іван: — Сваю сямейную гісторыю я даведаўся толькі шэсць гадоў таму. Родныя браты знайшлі мяне праз канцэртнага дырэктара Вольгу. Яны расказалі, чаму я застаўся ў дзіцячым доме. Мой бацька-серб жыў у Расіі (цяпер у мяне там шмат родных), бабуля — у Бабруйску. Маці-цыганка нарадзіла мяне раней за прызначаны тэрмін. Аддала немаўля часова ў бальніцу і сказала, што забярэ. Там, у Расіі, засталіся яшчэ дзеці — дзесяць чалавек родных. І калі яна вярнулася, мяне проста не аддалі. Час быў іншы, савецкі, маўляў, ваша дзіця хваравітае, былі яшчэ і складанасці з дакументамі. Вядома, я не шкадую і нікога не вінавачу ў тым.

Выхоўваўся ў бабруйскім дзіцячым доме. Затым адправілі ў інтэрнат у Бялынічы. Там я вучыўся дзевяць гадоў, пасля апынуўся ў Магілёве, у 70-м вучылішчы пад кіраўніцтвам Алега Адамавіча Бахановіча, цяпер гэта прафесійна-тэхнічны каледж, атрымаў прафесію сталяра-рэзчыка па дрэве.

У Магілёве ж пачалася мая прафесійная кар'ера ў іншым напрамку. Спяваць я пачаў раней, чым гаварыць — у пяць гадоў, былі пэўныя праблемы з маўленнем. Памятаю, глядзеў тэлевізар, а там Ігар Нікалаеў выконваў «Старую мельницу». Так я пачаў спяваць.

У бялыніцкай школе ўдзельнічаў у інструментальна-вакальным ансамблі, мы займалі першыя месцы сярод школ. Ансамбль быў цудоўны, мы ездзілі ў Германію выступаць па розных гарадах — Мюнхен, Берлін, Кёльн. Адбывалася гэта па чарнобыльскай праграме. Для нас, дзяцей-сірот, такія паездкі былі вельмі цікавыя. Быў цудоўны час, шыкоўны...

Пры вучылішчы існаваў ансамбль «Дружбакі і сяброўкі», там я нейкі час спяваў, потым працаваў. Мы таксама займалі першыя месцы сярод навучальных устаноў вобласці. Выконвалі знакамітыя каверы, у тым ліку на беларускай мове.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

У актыўным рытме

ПРАФЕСІЯ ВЕЧНАЙ МАЛАДОСЦІ,

або На адной хвалі з танцпадлогай

Яго рабоце можа пазайздросціць мноства маладых людзей. Мікшар, навушнікі, ноўтбук і музыка — вось асноўныя складнікі яго занятку. Юрый ЛЯВОНЬКІН, больш вядомы як DJ Yura Dels, распавёў нам, як «завесці» любую публіку, дзе навучыўся дыджэінгу і з якімі цяжкасцямі яму даводзіцца сутыкацца.

— Увогуле, у мяне дзве адукацыі, па адной я тэхнік-электрык, а па другой — выкладчык фізічнай культуры, але па іх я не працаваў. Знаёмства з дыджэінгам адбылося, калі мне было шаснаццаць гадоў, тады я яшчэ жыў у сваім родным Наваполацку. Сябар вырашыў схадзіць на курсы дыджэяў для падлеткаў, якія арганізоўваў адзін клуб, ну і запрасіў мяне за кампанію. Я пайшоў і пачаў уцягвацца ў гэты занятак. Навучанне праходзіла дзесьці два-тры месяцы, а ў канцы чакала здача фінальнага выпрабавання. Яно заключалася ў тым, што па тры чалавекі павінны былі па чарзе стаяць за пультам на школьнай дыскатэцы, і так некалькі раўндаў, пакуль не застанецца пераможца. Я вылецеў на пачатковым этапе. Вядома, спачатку жудасна знерваваўся, але потым узяў сябе ў рукі і напрасіўся ў вучні да аднаго знаёмага, які ўжо працаваў у гэтай сферы. Прыходзіў займацца перад яго выступленнямі, вывучаў работу з апаратурай, слухаў парады адносна наведвальнікаў. І сёння вельмі ўдзячны яму, што тады ён быў для мяне апорай.

Пасля наш герой стаў працаваць у свайго ж настаўніка на розных дыскатэках «на разагрэве». Так незаўважна дарос да арганізацыі ў клубе ўласнага мерапрыемства. Разумеючы, што гэта яго шанц, Юрый запрасіў дыджэя з Мінска з умовай, што той зробіць з часам зваротную прапанову. Яго задума апраўдалася, і пасля некалькіх выступленняў у сталіцы Юрый пераехаў сюды жыць і прафесійна развівацца.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Трэці працоўны

СТУДАТРАДАЎСКАМУ РУХУ — РАЗНАСТАЙНАЯ ПАДТРЫМКА

А жаданні пашчыраваць байцам не займаць

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі працаўладкаваў у складзе студатрадаў каля 22 тысяч чалавек, паведаміў другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ на прэс-канферэнцыі, прысвечанай укладу студэнцкіх атрадаў у развіццё краіны.

«Усе найважнейшыя будоўлі, самыя буйныя аб'екты — Нацыянальная бібліятэка, стадыён «Дынама», «Мінск-Арэна», Вялікі тэатр оперы і балета, а таксама аб'екты ў абласных цэнтрах — так ці інакш звязаныя са студэнцкімі атрадамі. На сённяшні дзень каля 22 тысяч хлопцаў і дзяўчат адпрацавала ці прыступіла да работы ў іх. Гэтая лічба вельмі добрая ў параўнанні з 2019 і 2020 гадамі. У рамках рэспубліканскага праекта «Выбіраем студатрад» колькасць ахвотных папрацаваць на працягу года ў нас склала каля 30,5 тысячы з усёй краіны», — распавёў Аляксандр Прохараў.

Трэці працоўны семестр яшчэ не скончаны. «Сёлета мы зрабілі акцэнт на развіцці новага кірунку — рэалізацыі рэспубліканскіх працоўных праектаў. У прыватнасці, гэта «Горад маладосці» — Усебеларуская маладзёжная будоўля ў Астраўцы, дзе працуюць 120 чалавек, у тым ліку з Расійскай Федэрацыі. Мы рэалізавалі працоўны праект «Атлант» на базе Мінскага завода халадзільнікаў, дзе працуюць 235 чалавек. У гэтым годзе ўпершыню арганізавалі сельскагаспадарчы праект «Талачын» на базе мясцовага кансервавага завода. Хлопцы і дзяўчаты займаліся ўборкай чырвоных парэчак», — адзначыў другі сакратар ЦК БРСМ.

Паводле яго слоў, наладжана актыўнае супрацоўніцтва БРСМ з Расійскімі студэнцкімі атрадамі. У прыватнасці, арганізаваны працоўны праект «Арляня» на базе Усерасійскага дзіцячага аздараўленчага цэнтра ў Краснадарскім краі.

«Дзякуючы падпісаным пагадненням з Мабільнымі кадрамі Расіі БРСМ змог рэалізаваць новы праект па будаўніцтве магістраляў М1 Брэст — Масква і М12 Масква — Казань. Першая група ўжо вярнулася. Дастойная заработная плата, добрыя ўмовы, усе задаволеныя. Будзем гэты праект працягваць», — канстатаваў ён.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Слова дэлегатам

З'ЕЗД АДБЫЎСЯ — НОВЫЯ МЭТЫ ПАСТАЎЛЕНЫ

На 44-м з'ездзе Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі больш за 500 актывістаў сабралася разам, каб абмеркаваць актуальныя пытанні. Дэлегаты прынялі стратэгію развіцця арганізацыі да 2025 года. Асноўнымі напрамкамі, па якіх будзе развівацца маладзёжны саюз, сталі грамадзянска-патрыятычнае выхаванне, працаўладкаванне моладзі, падтрымка талентаў, валанцёрскі рух, здаровы спосаб жыцця, партнёрства з арганізацыямі, інфармацыйна-іміджавая дзейнасць. Мы пагутарылі з дэлегатамі з'езда, якія падзяліліся сваімі ўражаннямі пасля сустрэчы і цікавымі перспектыўнымі ідэямі.

— Асаблівасцю гэтай сустрэчы сталі адкрыты дыялог органаў улады з моладдзю ў свабодным фармаце, магчымасць заявіць пра свае творчыя праекты і ідэі, — распавёў **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа імя Л. С. Выгоцкага Віктар ФІЛІПЕНКА.** — Меркаванне кожнага будзе пачута, а праекты — ажыццёўлены. Сёння БРСМ працуе з сучаснай моладдзю зусім інакш, чым раней. Шмат інтэрактыўных формаў работы, яркія лідары арганізацыі, але разам з тым нам патрабуецца перазагрузка. Над гэтым і будзе працаваць новы актыў арганізацыі ў найбліжэйшыя гады. Надышоў час новых ініцыятыў, праектаў, я ўпэўнены, што ўсё атрымаецца. У нас ёсць неабмежаваныя рэсурсы энергіі, крэатыўнасці і сацыяльнай актыўнасці маладых людзей. Моладзь заўсёды была, ёсць і будзе рухавіком прагрэсу і якасных змен.

На працягу васьмі гадоў актывісты атрада «ЭкалогіЯ» каледжа рэалізоўваюць комплекс мерапрыемстваў па фарміраванні ключавых кампетэнцый у галіне ўстойлівага развіцця і спрыяюць рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі да 2030 года. Тры гады запар, з 2018 да 2020 года, наш атрад становіцца найлепшым у краіне па выніках рэспубліканскага конкурсу «Моладзь за чысціню гарадоў і вёсак» у намінацыі «Найлепшы валанцёрскі атрад сярод устаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі». Бягучы год для актывістаў нашай арганізацыі асабліва знакавы. Наш каледж і Веткаўскі музей старавераства і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава сумесна рэалізавалі эколага-краязнаўчы праект «Галасы вёсак, якія сышлі», прысвечаны 35-годдзю аварыі на Чарнобыльскай АЭС і іншыя.

Для **настаўніцы замежных моў Міжлудескай сярэдняй школы Бярозаўскага раёна Людмілы ХЛЯВІНСКАЙ** 44-ы з'езд БРСМ стаў дэбютным. Аднак са студатрадаўскім рухам яна ідзе побач ужо дзесяць гадоў.

— Атмасфера была неверагодная, было цікава пагутарыць з калегамі, абмяняцца ідэямі і вызначыцца са стратэгіяй развіцця на найбліжэйшыя гады. Наш атрад «Гарачыя сэрцы NEW» імя Л. С. Выгоцкага дзейнічае ў Бярозаўскім раёне ўжо каля дзесяці гадоў, і за гэты час мы сабралі велізарную каманду аднадумцаў. Мы працуем як адзіны арганізм: знаёмім школьнікаў з тым, што можа даць старт у асабістым і прафесійным росце.

Педагог-арганізатар сярэдняй школы № 22 Гомеля і пераможца рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года — Добрае сэрца» ў намінацыі «Асабісты ўклад» Яніна ГАРБАЧЭЎСКАЯ шэсць гадоў таму стварыла ў школе валанцёрскі атрад «Млечны шлях», сёння ў ім 25 чалавек. «Збіраем у гандлёвых цэнтрах канцылярыю і ўручаем дзецям з маламаёмасных сем'яў з усёй вобласці ў рамках акцыі «У школу з Добрым сэрцам». Усяляк дапамагаем пажылым. У школе я адкрыла аб'яднанне па

інтарэсах «Юны валанцёр», туды набіраю хлопчыкаў і дзяўчынак з 6 класа. У найбліжэйшай будучыні адкрыем школы валанцёраў і трэнераў. Гэта вельмі важна, таму што цікавасць моладзі да валанцёрства велізарная. Хто разумее, што псіхалагічна гатовы пастаянна быць у кантакце з рознымі людзьмі, застаецца».

Адзінаццацікласнік сярэдняй школы № 3 Светлагорска, актывіст БРСМ, пераможца інтэрнэт прэміі «IT-Youth 2021» у намінацыі «За папулярызацыю дзейнасці ГА БРСМ і маладзёжнай палітыкі ў сацыяльных медыя» Аляксей ПІНЧУК падзяліўся сваімі думкамі:

— Вельмі важна, што арганізацыя не стаіць на месцы, а імкнецца да чагосьці новага, але разам з тым захоўвае і традыцыйныя напрамкі. Я згодны з членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Дзмітрыем Варанюком, які адзначыў, што многія праекты рэалізоўваюцца ў арганізацыі доўгія гады, і здавалася б, яны маглі страціць актуальнасць — але не! Напрыклад, папулярны рэспубліканскі конкурс «100 ідэй для Беларусі» — візітная картка БРСМ. Я захапляюся блогерствам, актыўна выказваю сваю грамадзянскую пазіцыю наконт таго, што адбываецца, падтрымліваю кіраўніка дзяржавы, дзялюся навінамі пра дзейнасць Саюза моладзі.

Аляксей Пінчук лічыць, што краіна павінна выхоўваць патрыётаў, якія будуць любіць Беларусь, шанаваць традыцыі і гісторыю, захоўваць мір і спакой на роднай зямлі. А таксама ўзмоцнена працаваць з моладдзю ў сацыяльных сетках. «Гэта добрыя сродкі самарэалізацыі і грамадскай камунікацыі. Трэба стварыць сістэму, што будзе ўяўляюць сабой супольнасць карыстальнікаў, якіх аб'ядноўваюць агульныя ідэі і інтарэсы, правільная інфармацыя».

Першы сакратар Савецкага раённага камітэта БРСМ Гомеля Сняжана КЛІМЯНОК падзялілася думкай, што 44-ы з'езд Саюза моладзі адрозніваўся ад іншых сваім фарматам.

«У нас ёсць неабмежаваныя рэсурсы энергіі, крэатыўнасці і сацыяльнай актыўнасці маладых людзей. Моладзь заўсёды была, ёсць і будзе рухавіком прагрэсу і якасных змен».

— Гэтым разам сышлі ад фармалізму і афіцыйных справаздач і дакладаў. З арганізацыяй я пазнаёмілася ў 2010 годзе. Самы яркі праект для мяне — грамадзянска-патрыятычная акцыя «Беларусь — зямля славы ратнай». Хацелася б яе вывесці на новы ўзровень і пачаць цесна супрацоўнічаць з іншымі краінамі, дзе здзейснілі подзвіг нашы землякі. Вельмі плённа працуем у валанцёрскім кірунку. Працягвае працаваць «гарачая лінія» па COVID-19. Летась штаб працоўных спраў Савецкага раёна быў прызнаны найлепшым у Гомелі па працаўладкаванні моладзі. Сёлета паставілі мэту ўтрымаць гэтую планку.

Старшыня Маладзёжнага савета Магілёўскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў, старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі навучэнцаў Магілёўскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа Кірыл ШУСЦІК адзначыў, што атмасфера на з'ездзе БРСМ спрыяла адкрытай размове. «Прыемна, што моладзь выказвае сваё меркаванне актыўна і ўпэўнена. Удзельнічаючы ў такіх мерапрыемствах, штораз адчуваеш сябе часткай вялікай і сапраўды важнай падзеі. Вельмі важна рэалізоўваць ініцыятывы рознага маштабу. Менавіта мы цяпер рыхтуем маштабны абласны праект да Дня народнага адзінства «Маршрут адзінства». Хацелася б, каб ён стаў прыкладам дружбы і супрацоўніцтва прафсаюзных арганізацый і БРСМ для ўсёй краіны».

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота з сайта БРСМ.

СТУДАТРАДАЎСКАМУ РУХУ — РАЗНАСТАЙНАЯ ПАДТРЫМКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

«Заработная плата, вядома, у першую чаргу залежыць ад колькасці адпрацаваных дзён і ад аб'ёму работы. Найбольш высокая яна традыцыйна ў будаўнічых атрадах. У педагагічных крыху ніжэйшая. У сельскагаспадарчых таксама бывае па-рознаму. У якасці прыкладу прывяду тую ж уборку чырвоных парэчак у рамках праекта «Талачын». Асобныя байцы пры выкананні нормы замест 500 атрымалі 900 рублёў», — распавёў Аляксандр Прохараў.

Паводле яго слоў, у сярэднім зарплата ў студатрадах — 700 рублёў і вышэйшая: «Але, зыходзячы з вопыту мінулага года, магу сказаць, што ў будаўнічым атрадзе ў Салігорску адзін з хлопцаў атрымаў за месяц і сем рабочых дзён 2,3 тысячы. Гэта значыць, усё кажа пра тое, наколькі байцы мэтанакіраваныя. Вядома, такую суму трэба зарабіць. Але магу сказаць адно — заработная плата сёння ў студатрадах дастойная».

Аляксандр Прохараў нагадаў, што на з'ездзе БРСМ прынята стратэгія развіцця арганізацыі да 2025 года. «Вялікая ўвага ў ёй аддадзена развіццю студатрадаўскага руху. У першую чаргу нам трэба паглядзець на інфармаванасць моладзі, работу ў інтэрнэце, развіццё карпаратыўнай культуры. Мы на сістэмную аснову павінны вывесці работу па навучанні адказных за арганізацыю студатрадаў. Сёння Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў павінен стаць своеасаблівым маладзёжным цэнтрам занятасці — ад акумулявання заявак, што паступаюць, да аператыўнага інфармавання ахвотных пра тое, дзе і калі яны могуць папрацаваць, якая заработная плата», — сказаў ён.

«У цэлым мы гаворым аб мэтанакіраванай дзейнасці па папулярызацыі працы як каштоўнаснай катэгорыі. Сумесна з Міністэрствам адукацыі вялікую ўвагу ў найбліжэйшы час аддадзім павышэнню прывабнасці рабочых спецыяльнасцяў і прафесій сярод студэнцкай і вучнёўскай моладзі», — дадаў другі сакратар ЦК БРСМ.

У наступным годзе Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі запусціць працоўны праект у ААТ «МАЗ», паведаміла журналістам **камандзір Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў Надзея ШАХОЎСКАЯ.**

«Набор у студэнцкія атрады працягваецца, таму што яны, у прынцыпе, працуюць цэлы год. Вядома, асноўны перыяд — летні. Але, тым не менш, яшчэ ў верасні, кастрычніку і лістападзе хлопцы і дзяўчаты працуюць, — распавяла Надзея Шахоўская. — Той атрад, які ўдзельнічае ў міжнародным праекце «Кузбас 300», шчыруе ў Кемераве, будуе там сацыякультурныя аб'екты — гэта найлепшы будаўнічы атрад Беларусі. У цэлым праекты ствараюцца па кіранках дзейнасці. Напрыклад, сёлета ў нас новы падрадчык — «Амега» — у Краснадарскім краі, куды студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання паехалі работнікамі кухні і афіцыянтамі. На будаўнічы праект з Мабільнымі кадрамі Расіі бралі падрыхтаваных хлопцаў будаўнічых спецыяльнасцяў. Налета плануем стварыць асобны праект у ААТ «МАЗ», дзе будуць працаваць аўтаслесары і студэнты аўтамеханічных спецыяльнасцяў».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Майстар-клас

АЖЫВІЛІ «РАМОНКАВАЕ ПОЛЕ»

Студэнты БДУ распрацавалі дызайн пакояў рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў

У каманду ўвайшлі чацвёртакурснікі факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ Вераніка Міхнавец, Анастасія Скакун, Паліна Іванчык, Віктарыя Іванчык, Лізавета Гіцук, Марыя Галіца і Яна Волкава, якія працавалі пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры мастацтваў і дызайну асяроддзя Алены МАТРОСАВАЙ.

Дзяўчаты стварылі праект дызайну інтэр'еру пяці жылых памяшканняў для сумеснага пражывання бацькоў і дзяцей у гасцявым корпусе «Рамонкавае поле» Рэспубліканскага рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў. На працягу двух месяцаў яны займаліся стварэннем стылістыкі памяшканняў, падборам колераваў палітры, мэблі, тэкстылю, дэкору.

Таксама студэнткі выканалі трафарэтную размалёўку сцен у калідоры з выявамі прыроды і жывёл.

У прэс-службе ўніверсітэта паведамілі, што каманда дызайнераў факультэта сацыякультурных камунікацый супрацоўнічае з цэнтрам ужо на працягу пяці гадоў. За гэты час было афармлена некалькі навучальных класаў. Таксама плануецца правядзенне касметычнага рамонту ў памяшканнях трэцяга паверха гасцявога корпуса «Рамонкавае поле» рэабілітацыйнага цэнтра.

За сваю работу члены дызайнерскага калектыву БДУ ўзнагароджаны падзякамі Рэспубліканскага рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАФЕСІЯ ВЕЧНАЙ МАЛАДОСЦІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Шчыра кажучы, я не заўважыў вялікай розніцы, дзе выступаць: у маленькім горадзе ці ў Мінску. Менталітэт у нас усюды прыблізна аднолькавы. А вось калі выступаў у Літве, заўважыў, што там усё ўладкавана зусім па-іншаму. Пачынаючы ад адгароджвання дыджэя ад публікі, заканчваючы энергетыкай людзей. На сённяшні дзень я працую ў асноўным з моладдзю, бо менавіта гэты кантынгент часцей за ўсё ходзіць у клубы. Пару разоў даводзілася працаваць з падлеткамі на выпускным. Наогул навучыцца прафесіі дыджэя можа любы, у каго ёсць хоць бы мінімальны музыкальны слых, пачуццё рытму і цярпенне. Прынцып работы досыць просты. У цябе ёсць спецыяльнае абсталяванне, з дапамогай якога трэба зводзіць і мяняць трэкі. Галоўнае правіла — пераход павінен быць плаўны, я нават сказаў бы амаль незаўважны, каб адпачывальнікі не паспелі страціць рытм танцпляцоўкі. Акрамя таго, некаторыя дыджэі любяць падчас сваіх выступленняў накладваць на музыку розныя эфекты. Але з гэтым трэба быць акуратнымі, бо калі перабраць, то дыскатэка можа ператварыцца ў «іншапланетную галактыку».

Самае складанае ў прафесіі дыджэя, па словах Юрыя, — гэта ўменне падладжвацца пад наведвальнікаў клуба. Бо нават калі ты жыць не можаш без кантры або класікі, для маштабнай вечарынкі такая музыка відавочна не «пойдзе». Прыходзячы ў клуб, у пачатку мерапрыемства наш сураможнік уключае пару розных трэкаў і назірае за рэакцыяй публікі. Калі ён бачыць, што праз пару ідэнтычных песень людзі не могуць сябе стрымліваць ды пачынаюць танцаваць, то ён правільна ўлавіў настрой. А калі госці паводзяць сябе скавана, то ён неадкладна мяняе музычную канцэпцыю. Акрамя праблемы з падборам музычнага рэпертуару, сярод цяжкасцяў наш герой згадвае неадэкватных наведвальнікаў і ненармаваны графік жыцця. Першае сустракаецца не вельмі часта, а вось другое побач з Юрыем на працягу доўгіх гадоў — дыскатэкі праводзяцца ў асноўным у начны час.

— Вядома ж, у маёй прафесіі, акрамя цяжкасцяў і складанасцяў, ёсць мноства плюсоў. Самыя відавочныя — пастаянныя стасункі з людзьмі і атрыманне ад іх энергіі. Бо калі наведвальнікам падабаецца тое, што я раблю, мая музыка, адразу ж адчуваю аддачу ад іх, якая цалкам напаўняе. Ведаеце, многія лічаць, што дыджэем нельга працаваць доўгі час, і ў думках адпраўляюць людзей «за трыццаць» на пенсію. Але гэта памылковае меркаванне. За мяжой увогуле няма ўзроставых абмежаванняў у дадзенай прафесіі, я і сам ведаю мноства прафесіяналаў сваёй справы, якім не тое што за трыццаць, а за сорак і нават пяцьдзясят. Для мяне дыджэй — прафесія вечнай маладосці, бо ты пастаянна знаходзішся з моладдзю на адной хвалі, вывучаеш новыя трэнды. Гэты занятак таксама абавязвае цябе развівацца ў розных сацыяльных сетках. Ну і да таго ж нельга пастарэць душой таму, хто сваё жыццё прысвячае музыцы. А жывое яе выкананне ці работа з электроннымі носьбітамі — не мае значэння.

Ангеліна НОВІКАВА.
Фота дадзена героем.

Камертон настрою

Сумясціць будаўніцтва і творчасць? Лёгка!

Другакурсніца Чэрвеньскага прафесійнага будаўнічага ліцэя Дзіяна КАЛЬКІНА — асоба рознабаковая. Дзяўчына — першая сярод усіх навучэнцаў у вучобе. Сёлета яна атрымала дыплом трэцяй ступені ў конкурсе «Найлепшы навучэнец установы прафесійнай адукацыі Мінскай вобласці» ў намінацыі «За папулярызацыю рабочых прафесій сродкамі мастацка-творчай дзейнасці».

Наогул, творчасць суправаджае гераіню з самага дзяцінства. Суразмоўніца спявае, арганізоўвае мерапрыемствы, выступае ў ролі вядучай. Нядаўна Дзіяна нават прайшла першы этап перадкастынгу на шоу «Х-Фактар» і атрымала прапанову паспрабаваць сябе ў наступным. Аб сваёй будучай прафесіі і любові да творчасці гераіня расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».

— Вучуся па спецыяльнасці «Аздабленча-будаўнічыя работы», буду тынкоўшчыкам-маляром. Улетку прайшла сваю першую практыку, якая доўжылася тры месяцы. Вырашыла спыніцца на вядомай будаўнічай арганізацыі ў Мінску, вельмі спадабаўся атрыманы вопыт! Спачатку, зразумела, было нязвыкла, аднак прайшоў некаторы час, — і стала ўпэўнена сябе адчуваць сярод больш дасведчаных калег, якія, калі было патрэбна, вельмі мне дапамагалі.

Дзіяна вызначылася з прафесіяй яшчэ дзіцём. Справа ў тым, што ў дзяўчынкі перад вачыма заўсёды быў станоўчы прыклад — яе дзядуля.

— Ён будаўнік. Памятаю, як у маленстве расказваў пра сваю прафесію, і мяне гэта вельмі захапляла. Шчыра кажучы, калі б бацькі мяне не падтрымалі ў свой час, я не рызыкнула пайсці вучыцца па будаўнічай спецыяльнасці. Але сёння з упэўненасцю магу сказаць: зусім не шкадую, што абрала менавіта такі шлях. Цяпер у ліцэі мой сярэдні бал складае 9,5, я вельмі стараюся ўдасканальваць свае навыкі і веды па



абранай спецыяльнасці. Падабаецца, што тут да ўсіх нас паважліва ставяцца, адно аднаго падтрымліваюць, у нас вельмі дружная група. Што датычыцца конкурсу, у якім я заваявала дыплом трэцяй ступені, то ў ім удзельнічала другі год. Летась таксама атрымала такі ж вынік. Гэтая ўзнагарода вельмі ганаровая для нашага ліцэя і для мяне асабліва. Падчас этапаў нам трэба было расказаць аб прафесіі, паказаць свае навыкі з дапамогай творчасці. Я сумясціла будаўніцтва і спевы. Рыхтавалася з майстрамі і педагогам-арганізатарам. Увогуле, з дзяцінства ездзіла на школьныя, раённыя конкурсы, без гэтага было б нецікава вучыцца, да чагосьці імкнуцца. Не маю за мэту быць першай, у конкурсах мне падабаецца сама атмасфера.

Самае галоўнае правіла Дзіяны — не сядзець на месцы. «Нядаўна купіла гітару і самастойна авалодваю гэтым майстэрствам. Знаёмлюся з аднадумцамі, пакуль ёсць час перад новым навучальным годам, займаю сябе рознымі хобі па максімуме. Любоў да творчасці пачалася з маленства, калі бацькі аддалі мяне ў музыкальную школу. Хор, сальфеджыа, вакал, фартэпіяна... Праз некаторы час усё гэта стала цяжка сумяшчаць з вучобай у школе, таму сканцэнтравалася толькі на вакале. Кожныя выхадныя ездзіла ў Мінск у студыю, дарэчы, стала дыпламантам першай ступені ў конкурсе Маладзёжнага тэатра эстрады. Цяпер працягваю спяваць. А калі даведалася, што ў сталіцы будзе праходзіць вядомы конкурс «Х-Фактар», вырашыла скарыстацца шанцам, — і ўсё атрымалася, я спадабалася журы».

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота з архіва гераіні.

SEX=БАЛЯСЫ

НАМЁКІ І «АЛАВЕРДЫ»

На жаль альбо на шчасце, але мы не заўсёды, не ўсё і не ўсім можам сказаць проста ў вочы. («— Даруйце, мадам, але я не той, хто вам патрэбны. — А хто мне патрэбны? — Псіхатэрапеўт. Другі кабінет налева».) А што рабіць, калі нейкім чынам пэўную інфармацыю да іншых давесці ўсё ж трэба? Тады, як правіла, у ход ідуць намёкі і паўнамёкі. («Сёння горача. Спаць вырашыла без сподняга з адчыненым акном. Так перажываю, каб ніхто не залез у жыллё, бо жыву я адна на першым паверсе, на вуліцы Кастрычніцкай, дом 77, кватэра 1».) Праўда, часам застаецца толькі здагадвацца, ці пачуты твой пасыл, а калі пачуты — наколькі дакладна, ці нічога не пераблытана. («Муж-узбек кажа рускай жонцы: «Дарагая, калі я прыйду дадому і цюбецейка ў мяне будзе на галаве справа, значыць, я ў добрым настроі. Буду казаць табе прыемнае, дарыць падарункі, кахаць цябе. А калі цюбецейка будзе на галаве злева, дрэнь справа. Буду сварыцца з табой, паўсюдна бачыць адны хібы». Жонка ў адказ: «Дарагі, калі ты прыйдзеш дадому, а рукі ў мяне будуць скрыжаваныя на грудзях, гэта значыць, што мне абсалютна наплаваць, з якога боку ў цябе на галаве цюбецейка».) Гэта я ўсё да чаго?

Ці ведаеце, што нядаўна герцагіня Сасекская, жонка прынца Гары Меган Маркл адзначыла сваё 40-годдзе? («Вы заўважалі, што з узростам, калі нехта пытаецца ў вас: «Памятаеш Сярогу? (любое іншае імя)», дык пасля гэтага ніколі не бывае добрай навіны?») З такой нагоды яна запісала відэа для дабрачыннай арганізацыі, у якім заклікала жанчын вярнуцца на рабочыя месцы ў сувязі з паляпшэннем сітуацыі з пандэміяй каранавіруса. («Убачыла, што Месяц расце, і на ўсялякі выпадак паказала яму ўсе грошы, якія ёсць. І грудзі. А раптам?») Але сутнасць не ў гэтым. Для здымак Маркл улажыла валасы ў нізкі пучок, выпусціўшы некалькі пасмаў каля твару. Тайны сэнс яе ўкладкі ўбачыў брытанскі стыліст і цырульнік Том Сміт, піша Daily Mail. Аказваецца, лічыць ён, герцагіня робіць так у выпадку, калі жадае выказацца на сур'ёзную тэму. («Калі яна сказала яму: «Ты самы лепшы!» — ён зразумеў, што недзе было спаборніцтва».)

«Такая прычоска дазваляе ёй выказаць сваю цеплыню і адкрытасць і пры гэтым прадэманстраваць гледачам сілу і непахіснасць характару. Яна паказвае, што хоча абмеркаваць сур'ёзныя рэчы», — выказаўся эксперт і адзначыў, што апісаная ўкладка валасоў стала фірменным стылем жонкі брытанскага прынца. («Лена і Коля жывуць у поўнай сямейнай гармоніі: аднолькавыя густы, аднолькавыя ідэі, аднолькавыя жаданні. Вось толькі ў Колі сышло тры гады, каб да ўсяго гэтага прызвычаіцца».) На думку цырульніка, з распушчанымі валасамі на відэа герцагіня здавалася б занадта юнай і гуллівай. («Добры афарызм, як міні-спадніца — коратка і прыцягальна».) Ён вывеў, што яе здаровыя і прыгожыя валасы сведчаць аб поўным аднаўленні пасля другіх родаў. Ну, гэта можа быць. А ў астатнім — ці правільна ён зразумеў «намёк»? («Жонка раніцай мужу ў спальню: «Тук-тук». Той: «Хто там?» Жонка: «Любоў усяго твайго жыцця». Муж: «Не падманвай, піва не ўмее гаварыць».)

У працяг тэмы знешнасці і дасланых-атрыманых пасылаў. («Маладая жонка тэлефануе маці: «Мам, майму не спадабалася твая фірменная каша, паўтары рэцэпт». Маці: «Бярэш крупы, адварваеш...» Дачка: «А! Адварваеш!..») Прычоска ў стылі ліхадзейкі Круэлы дэ Віль з папулярнага аднайменнага фільма стала новым модным трэндам. («Дзве бутэлькі шампанскага дапамаглі выпускніцы зразумець сэнс усіх песень Ірыны Алегравай».) Пра гэта паведамляе Independent. Выпадковасць? Не думаю, як той казаў. («Мастацтва маркетолага ў тым, каб у пакупніка ўзнікла адчуванне, што ён моцна абрабаваў краму. Хоць на самай справе ўсё наадварот».) Гаворка ідзе пра афарбоўванне валасоў у чорны і белы колеры адначасова. Заснавальніца брытанскага салона прыгажосці Marla Hair (не здзівіліся гэтаму «супадзенню»?) Джэсіка Патчынг растлумачыла, што найбольш папулярным варыянтам такой прычоскі з'яўляецца таніраванне паловы галавы ў цёмнае адценне, а паловы — у светлае. («Калі ў жонкі на твары паўтоны касметыкі — гэта нічога, а калі ў мужа на твары крыху памады — дык гэта ўжо канец свету».)

«Не менш важным з'яўляецца выбар колераў. Яны павінны быць максімальна кантрастныя, каб не злівацца адзін з адным. Такая прычоска падыходзіць абсалютна ўсім, незалежна ад полу, узросту і тыпу валасоў. Калі вы хочаце, каб ваша афарбоўка заўсёды выглядала свежай і яркай, я рэкамендую выкарыстоўваць шампуні без сульфатаў, а таксама адзін раз на месяц праводзіць працэдуру таніравання ў салоне прыгажосці», — падкрэсліла Патчынг. («Парада касметолага: для аксамітнай скуры твару і бляску валасоў жанчыне трэба... не працаваць».) Вядома таксама, што з падобнай аздобай былі заўважаны спявачкі Дуа Ліпа, Білі Айліш і Келані. Канешне, як такая прычоска не зробіцца модным трэндам, калі яна на галаве куміра? Фанаты цудоўна зразумелі пасыл. («Калі Залатую Рыбку, якая ўжо выканала тры вашыя жаданні, выкачаць у муцэ, яна зразумее намёк і выканае яшчэ парачку».)

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«СПЯВАЦЬ ПАЧАЎ РАНЕЙ, ЧЫМ ГАВАРЫЦЬ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Пачынаючы з 16 гадоў, падпрацоўваў у рэстаранах. Гэтую дзейнасць ужо можна назваць прафесійнай з музычнага пункту гледжання. І вось аднойчы на карпаратыве, у якім мы ўдзельнічалі, нас заўважыў Аляксандр Шакуцін, бізнесмен. Не толькі мяне, там была і Алена Ланская, мы з ёй выступалі дуэтам у «Дружбаках і сяброўках».

Праз тыдзень запрасілі прыехаць у Мінск на праслухоўванне. Тады пазнаёміўся з такімі вядомымі кампазітарамі, як Уладзімір Кандрусевіч, Леанід Прончак. Спадабаліся, прапанавалі пераехаць у Мінск. Я доўга думаў, сумняваўся, бо ў Магілёве ўсё такое роднае, і творчая дзейнасць, і работа — усё было наладжана. А тут неабходна пачынаць спачатку. Гэта заўсёды цяжка, трэба заваяваць публіку, заўсёды хваляванне, яно і цяпер ёсць, але, дзякуй Богу, усё добра, спяваем (*усміхаецца*).

Маё сапраўднае імя — Іван Казіміроўскі. Узяў сабе творчы псеўданім Іван Буслай, які цяпер ужо з'яўляецца маім афіцыйным прозвішчам. Чаму так? Усе сябры называлі мяне Буслік, Буслай, а Леанід Прончак прапанаваў узяць тое як псеўданім. Маўляў, бусел — сімвал Беларусі. І сапраўды, ён сугучны з гэтым словам, кароткі — мне спадабалася.

«СПРАВА НЕ Ў НАРОДНЫМ ЗВАННІ»

Іван: — На маіх канцэртах публіка заўсёды розная, таму ў песенным арсенале ёсць і рамансы, і поп-рок, у рэдкіх выпадках выконваю цыганскія кампазіцыі. Чаму рэдка? Многія не хочуць слухаць «цыганшчыну» (*усміхаецца*).

Раней было ўсё зразумела, у нас быў графік. А цяпер пандэмія, таму сёння ёсць работа, а заўтра, на жаль, можа ўсё адмяніцца. Я прывык працаваць, бо калі артыст расслабляецца, няма ўжо таго гучання голасу, спруты.

Да пандэміі ў нас былі вялікія туры па Беларусі. Цяпер пакуль не ездзім, хоць планы прадоўжыць заўсёды ёсць. На жаль, нашых людзей вельмі складана заахвоціць хадзіць на беларускія артыстаў. Раней гэта было неяк прасцей, што хаваць. Мы не прымушаем нікога. Самі робім рэкламу ў сацсетках, самі выстаўляем пэўную цану на квіткі, а людзі гавораць, што «дорага», хоць артыст пададаецца.

«ЛЕПШ ЗА СЯБЕ НІХТО НЕ ЗРОБІЦЬ»

Вольга: — У нас былі канцэрты з аншлагамі, асабліва паспяхова прайшла «Цыганская душа» ў 2016 годзе ў Мінску. Гэта была першая самастойная сольная праграма, з якой мы праехалі па Беларусі, зарабілі сольны канцэрт у родным горадзе Івана — Магілёве — і завяршылі тур з аншлагавым канцэртам у сталіцы. Усё паспелі зрабіць да пандэміі. Другі маштабны канцэрт з шоу-праграмай «Прысвячэнне» адбыўся ў 2019 годзе. Мы заўсёды сур'ёзна падыходзім да кожнага выступлення, рыхтуемся. Запрашаем артыстаў, шоу-балет, самі робім відэа, рыхтуем святло... Іміджам артыста Івана Буслая займаемся таксама самастойна.

Лепш за сябе ніхто не зробіць (*смяецца*). Іван нават касцюмы ўпрыгожвае — нашывае паеткі, пацеркі, калі трэба (*усміхаецца*), — карпатлівая работа! Аранжыроўкі робім за мяжой, гэта, вядома, дорага, аднак вельмі якасна. Нядаўна запісалі песню расійскага аўтара Аляксея Малахава «Огонек любви», ён супрацоўнічае з Кіркоравым, Пугачовай, Лепсам. Філіп Кіркараў дазволіў Івану выконваць сваю песню «Дива». Мы з ім знаёмыя асабіста, перад пандэміяй былі ў яго на сольным канцэрце. Песні «зводзім» у Швецыі, натуральна, дыстанцыйна. Працавалі над апошняй песняй паўтара года. У нас там ёсць свая каманда, з якой пастаянна супрацоўнічаем. Гэта, вядома, нятанна, аднак яно таго вартае. Цяпер чатыры песні ў рабоце. На гэта пойдзе шмат часу, бо мы сур'ёзна, карпатліва, вывяраючы кожную ноту, ставімся да сваёй дзейнасці.

Іван: — Супрацоўнічаем з Лерай Фаміновай, якая падарыла песню «Любовь», таксама з беларускім аўтарам Дзмітрыем Данілінным, цяпер якраз пачалі працаваць над адной з яго кампазіцый, якую ён нам таксама падарыў. Так, напрыклад, наш знакаміты аўтар Алег Жукаў дазволіў выконваць песню «Ах, эта ночь», першым выканаўцам якой з'яўляецца Мікалай Баскаў, а цяпер ужо афіцыйна і Іван Буслай. У мяне шмат хітоў, па якіх пазнаюць, — «По капелькам», песні гадоў шаснаццаць, а яна да гэтай пары актуальная, гучыць часта па радыё. За яе вялікі дзякуй аўтару Юліі Быкавай і кампазітару Яўгену Алейніку, вельмі шмат кампазіцый яны мне напісалі. Ёсць вядомыя трэкі «Достучаться до небес», «Рассветы», «Не грусти о ней», якія пастаянна просяць выканаць на канцэртах.

Вольга: — У наступным годзе плануем новую канцэртную праграму, спадзяюся, што пандэмія не перашкодзіць рэалізацыі нашых планаў. Можа, зробім тур па Беларусі з новым рэпертуарам, які збіраўся. Здзівіць адназначна, робім заўсёды непадобнае на папярэдняе шоу. Неаднойчы даводзілася назіраць, як спачатку скептычна рэагуюць на беларускага артыста, а пасля канцэрта, як ўбачылі шоу і ўвесь маштаб, нечакана для сябе адзначаюць, што гэта было таго вартае. Мы прывучаем да беларускай музыкі, роднай культуры, хочам данесці, што яе трэба слухаць і хадзіць на канцэрты айчынных артыстаў.

З канцэртным дырэктарам Вольгай Макаравай на юбілейным канцэрце Ф. Кіркорава ў Мінску, 2019 г.

«ПРАШУ СУСВЕТ, КАБ ДАПАМОГ»

Іван: — Я планую жыць да 150, не менш! Аднак у мяне ёсць дрэнныя звычкі. Гэта лянота і цыгарэты. Не магу кінуць курыць, прашу ўжо Сусвет, каб дапамог (*смяецца*). Хочацца, каб было шмат работы. Мае прыхільнікі кажуць: «Вой, які прыгожы хлопец Іван Буслай, а хлопцу ўжо сорак (*смяецца*). Дарэчы, сэрца маё свабоднае. Мне патрэбны чалавек сур'ёзны, які дажыве са мной да старасці. А пакуль у жыцці я і не паспеў нічога зрабіць. Хачу дабудаваць дом, шмат песень добрых, поўных залаў, бо калі яны такія, то прыемна працаваць. Трэба пра ўсё гэта прасіць Сусвет.

Калі казаць пра дзіцячы дом, то гэта добрая школа. А далей залежыць ад чалавека, асяроддзя і людзей, якія сустракаюцца на шляху. Хто ведае, кім я быў бы, калі б выхоўваўся ў цыганскай сям'і... Што было б са мной? Вядома, у жыцці трэба быць шчырым, справядлівым, спагадлівым, дапамагаць людзям. Тады Сусвет табе таксама дае ўзамен нешта станоўчае.

Я паспрачаўся б наконт вядомага стэрэатыпу, што любая цыганская душа нараджаецца музыкальнай. У мяне браты не спяваюць (*усміхаецца*). Трэба заўважыць у сабе талент, любіць сваю прафесію, жыць ёю, усё аддаваць. Гэта такі лёс, ведаеце, які даецца як прызначэнне, твая дарога.

Надзея ЗУЕВА.
Фота з архіва спевака.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 25.08.2021 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 октября 2021 года проводит 20-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
256	Грузовой бортовой ГАЗ-66 ш. 0482876 дв. 3416-87 1987 г. *4 кат. 2002 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	4 800,00	960.00
257	Мастерская МРМ № 239, 1976 г., на ЗиЛ-131 ш. 235254 дв. 295619 1976 г. *4 кат. 2282 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	12 000,00	2 400,00
258	Мастерская МРМ № 150, 1973 г., на ЗиЛ-131 ш. 106167 дв. 474775 1973 г. *4 кат. 1349 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	12 000,00	2 400,00
259	Грузовой бортовой ГАЗ-66-11 ш. 0662539 дв. 93503-91 1991 г. *4 кат. 1813 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	4 800,00	960,00
260	Грузовой бортовой ГАЗ-66-15 ш. 0627861 дв. 135841-90 1990 г. *4 кат. 394 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	5 000,00	1 000,00
261	Гусеничный тягач МТ-ЛБ (демилитаризованный) ш. 6Д9104001 дв. 9100781 1991 г. *4 кат. 12560,5 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	48 000,00	9 600,00
262	Грузовой бортовой Урал-43202 ш. 066329 дв. 994869 1986 г. *4 кат. 26188 км*	н.п. Лесная, в/ч 48668	10 000,00	2 000,00
263	Грузовой бортовой Урал-43202 ш. 053877 дв. 871953 1986 г. *4 кат. 55422 км*	н.п. Лесная, в/ч 48668	10 000,00	2 000.00
264	Автомобиль ГАЗ-66-04 с кузовом-фургоном К1М (модиф. К-66) в составе: Автошасси ГАЗ-66-04 ш. 0373429 дв. 109893-84 1984 г. *4 кат. 4607 км*. Кузов-фургон К1М (модиф. К-66) № 37К 1984 г. *4 кат.*	н.п. Лесная, в/ч 48668	4 800,00	960,00
265	Автомобиль ЗиЛ-131Н с кузовом-фургоном КУНГ-1М (модиф. К-66) в составе: Автошасси ЗиЛ-131Н ш. 834931 дв. 308766 1989 г. *4 кат. 715 км.* Кузов-фургон КУНГ-1М (модиф. К-66) № б/н 1989 г. *4 кат.*	г. Береза, в/ч 23324	5 500,00	1 100,00
266	Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 107907009 дв. 8814516 1979 г. *4 кат. 6570 км*	н. п. Новоколосово, в/ч 25819	80 000,00	16 000,00
267	Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108106021 1981 г. *4 кат. 7999 км*	н. п. Новоколосово, в/ч 25819	80 000,00	16 000,00
268	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: Кузов-фургон К1-131 № 06143 1978 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 303861 дв. 664532 1978 г. *3 кат. 974 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	6 000,00	1 200,00
269	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: Кузов-фургон КБ6-131 № 05269 1983 г. *4 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 538020 дв. 895803 1983 г. *3 кат. 3420 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	6 000,00	1 200,00
270	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: Кузов-фургон КБ6-131 № 12519 1984 г. *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 567558 дв. 047505 1983 г. *3 кат. 3434 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	6 200,00	1 240,00
271	Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: Кузов-фургон К4-131 № 10404 1980 г. *2 кат.* Автошасси ЗиЛ-131 ш. 368752 дв. 014414 1979 г. *3 кат. 1013 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	6 200,00	1 240,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 14 октября 2021 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до 15.00 11 октября 2021 года.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 14 октября 2021 г. с 9.15 до 10.00.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факсу (017) 319 35 41. Извещение опубликовано на сайте http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703

Продавец: ООО «Канстрой», 210027, г. Витебск, пр-т Строителей, 7-93

Предмет аукциона, расположенный по адресу: г. Витебск, пр-т Строителей, 7-96

Наименование (Назначение)	Начальная цена с НДС 20 %	Шаг аукциона
Неустановленно **(помещение неустановленного назначения)** общей площадью 177,7 кв. м, инвентарный номер 200/D-126577. **Обременение:** ипотека у ОАО «Банк БелВЭБ»	200 224,76 бел. руб.	10 011,24 бел. руб.

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Ответственное лицо: Быкова Людмила Константиновна, ликвидатор, +375 29 310-70-01

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

Затраты на организацию и проведение торгов и вознаграждение в размере возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 28.05.2021 г.

Дата, место и время проведения аукциона	**10.09.2021 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата, место и время окончания приема документов	**08.09.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5**
Продавец	**Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б**
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов (одним лотом)
Адрес: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Пугачева, д. 1А

Наименование (назначение)	Общ. пл., кв. м	Инвентар. номер	Состав. части
Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения	5375	640/С-1801	Три навеса
Железная дорога	254,2 м	640/С-109925	-
Проходная	37	640/С-27612	Навес
Станция пожаротушения	100,8	640/С-27613	Подвал

Сведения о земельном участке: пл. **2,0419** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения

Начальная цена лота с НДС 20 % – 1 486 074,00 бел. руб. (снижена на 3 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Оплата предмета аукциона (с учетом ранее внесенного задатка) производится в течение 5 (пяти) календарных дня с момента подписания договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.07.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 09.09.2021 в 11.00. Окончание торгов: 09.09.2021 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.09.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

ИНФОРМАЦИЯ О ФОРМИРОВАНИИ РЕЕСТРА ВЛАДЕЛЬЦЕВ ЦЕННЫХ БУМАГ

Полное наименование и местонахождение акционерного общества	**ОАО «Элегант»** Минская область, г. Жодино, пр. Ленина, 22
Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров	Наблюдательный совет ОАО «Элегант» Протокол заседания № 17 от 24.08.2021 года
Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров	**25 августа 2021 года**

УНН 600039318

01 сентября 2021 года в 12.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров, регистрация акционеров с 11.00 по 11.45 по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22 ОАО «Элегант», бухгалтерия

Повестка дня

1. Об избрании членов наблюдательного совета.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 25 августа 2021 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться с 9.00 до 11.00, начиная с 27 августа 2021 г. по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия, в день проведения собрания – по месту его проведения. Справки по телефону: (01775) 6-80-74.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНН 600039318

Наблюдательный совет.

Антикризисный управляющий ООО «МАГНУС групп» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 13.09.2021 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности ООО «МАГНУС групп»

ООО «Инвестиционная компания «Сокол» (размер задолженности – 2 166 696,63 BYN) – начальная цена 1 408 352,81 BYN; ООО «Инвестиционная компания «Сокол» (размер задолженности – 27 474 375,08 BYN) – начальная цена 17 858 343,80BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 10.09.2021 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 10.09.2021 г. на р/с ООО «МАГНУС групп» р/с BY08PJCB30120146281010000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 110, код PJCBBY2X, УНП 191112191.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 10 дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СКО «Брестагроздравница»

Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 100/U-90491 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 2754,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Знаменский с/с, 120/18, на земельном участке с кадастровым номером 121280800001000025, площадью 0,2478 га

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**63 280,00**	**Размер задатка, руб.**	**6 328,00**

Лот № 2: капитальное строение с инвентарным номером 132/С-18900 (наименование: незавершенное законсервированное капитальное строение; назначение: здание неустановленного назначения), площадью 6795,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивановский р-н, Мохровский с/с, д. Завышье, ул. Завышанская, 3/3, на земельном участке с кадастровым номером 123085001401000041, площадью 0,2488 га

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**301 600,00**	**Размер задатка, руб.**	**30 160,00**

Продавец: ОАО «СКО «Брестагроздравница», 225027, Брестская область, Брестский р-н, район п. Берестье, тел./факс 80162941334. **Условия продажи:** без условий. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона

Аукцион состоится 16 сентября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 15 сентября 2021 г. до 17.00

«ДЛЯ МЯНЕ ГАЛОЎНАЕ — РУХ»

Іншым разам лёс выдае такія незвычайныя павароты, што проста дзівішся. Змяняюцца цалкам ўклад жыцця, прафесія, месца жыхарства... Вось і былы настаўнік з Магілёва Людміла БІЛІЕЎСКАЯ пасля выхаду на пенсію вырашыла працягваць працоўнаю дзейнасць, але ў зусім іншай якасці. Усе апошнія гады яна працуе паштальёнам АПС «Магілёў-30» і заслужана лічыцца тут адным з найлепшых работнікаў.

Фота Сяргея РУЧАНАВА.

— Сама я — карэнная магіляўчанка, — расказвае Людміла Францаўна. — Усё маё жыццё непарыўна звязанае з горадам на Дняпры. Тут я вырасла, скончыла першую гарадскую школу — фізіка-матэматычны клас, паступіла ў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова на фізіка-матэматычны факультэт. Потым працавала выкладчыкам у політэхнічным тэхнікуме, так тады называлася гэтая навучальная ўстанова. Таксама працавала ў прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 58, дзе рыхтавалі будаўнікоў. Мой агульны педагагічны стаж складае 22 гады.

Па словах Людмілы Францаўны, апынуўшыся на пенсіі, яна так і не змагла з гэтым змірыцца. Добра адчувала, што яшчэ здольная працаваць, прыносіць карысць людзям, хацелася заставацца ў віры жыцця, актыўна рухацца, нягледзячы на ўзрост. А яшчэ вельмі хацелася мець зносіны з рознымі людзьмі. Вось так сярод шматлікіх прафесій яна выбрала спецыяльнасць паштальёна. І калі пачала абмяркоўваць умовы работы, адразу адмовілася ад прапановы быць аператарам сувязі. Яе прыцягвалі зусім іншыя магчымасці.

— У калектыве АПС «Магілёў-30» мяне сустрэлі вельмі добра, — працягвае суразмоўніца. — Тут пануе сапраўды камфортная і сяброўская атмасфера, зносіны паміж супрацоўнікамі вельмі добрыя. Кожны дзень я іду на работу з задавальненнем. Большую частку маёй падведамаснай тэрыторыі складае прыватны сектар. Там шмат зеляніны, і заўсёды, калі туды трапляю, як той казаў, не магу надыхацца чыстым паветрам. Такі насычаны рытм работы мне вельмі падабаецца. Я хутка адчула, што апынулася на сваім месцы.

З самага пачатку маёй работы на гэтым участку ў мяне склаліся прыязныя адносіны з жыхарамі мікрараёна, асабліва з пажылымі людзьмі. Яны ветліва сустракаюць мяне, запрашаюць у дом, спяшаюцца расказаць аб сваім жыцці, задаюць масу розных пытанняў. Іншым разам яны звяртаюцца з невялічкімі просьбамі. Напрыклад, прынесці паштоўку, канверт, а таксама тавары народнага спажывання. Некаторыя з такіх людзей з дому збольшага нікуды не выходзяць — маю на ўвазе тых, хто жыве ў шматкватэрных дамах. І нікому ніводнага разу я не адмовіла. Абавязкова выконвала ўсе просьбы. Не паверыце, наколькі прыемна пасля чуць ад людзей цёплыя словы ўдзячнасці!

Як падкрэсліла Людміла Францаўна, больш за ўсё яна шкадуе пажылых адзіноких людзей. Такіх на яе ўчастку хапае. Кожнага візіту паштальёна яны чакаюць з вялікім нецярпеннем. Таму што паштальён для іх — не проста служачы, а ў першую чаргу — чалавек, з якім можна падзяліцца і радасцю, і смуткам.

— Ёсць у маёй сённяшняй дзейнасці і надзвычай цяжкія моманты, — адзначыла паштальён. — Вось, напрыклад, нядаўна атрымала чарговы спіс людзей, якім неабходна прынесці пенсіі, і не ўбачыла ў ім адно знаёмае прозвішча. Дзядулі, якога я вельмі паважала і шкадавала. Цяжка было даведацца, што гэты прыемны і добразычлівы чалавек літаральна днямі пайшоў з жыцця.

І да гэтага часу я вельмі сумую па ім і па іншых людзях, да каго ўжо не зойдзеш у двор. Цяжка нават праходзіць каля іх дамоў. Вось у чым заключаецца самая змрочная старонка маёй дзейнасці. Можа, у мяне моцна развітае пачуццё суперажывання? Не ведаю...

Ёсць у Людмілы Францаўны і асабістае хобі. У час адпачынку яна любіць вандраваць. Па словах калег, аб'ездзіла амаль усю Еўропу. А марыць — толькі каб яе працоўныя будні працягваліся як мага далей і каб яна магла прыносіць як мага больш карысці людзям.

— Людміла Францаўна — на рэдкасць працавіты чалавек, — адзначыла **намеснік начальніка АПС «Магілёў-30» Ірына МАРОЗАВА.** — Жыццярадасная, вельмі камунікабельная, яна вызначаецца ўсімі неабходнымі якасцямі прафесіі паштальёна. Нам, кіраўніцтву падраздзялення, няма прычын хвалявацца за тое, што яна не выканае патрэбныя плановыя паказчыкі. Усё ў яе добра атрымліваецца. Не памылюся, калі скажу, што ў сваёй рабоце яна падае сапраўдны прыклад маладым работнікам пошты. Фору дасць кожнаму маладому паштальёну. Дарэчы, па падпісцы ў яе самая вялікая колькасць выданняў. Паспяхова ў яе ідзе рэалізацыя тавараў народнага спажывання, газет і часопісаў. Гэта — акрамя падпіскі.

Падагульняючы, магу сцвярджаць, што свае службовыя абавязкі гэты чалавек заўсёды выконвае на вышэйшым узроўні, што ў яе ўсё ладзіцца. Яна ніколі не маркоціцца, ды і калег па рабоце падбадзёрвае. Нягледзячы на тое што ў яе самы аддалены ўчастак, яна заўсёды напярадзе. Больш бы такіх супрацоўнікаў!

ПА СЛЯДАХ МАЦІ

Аб прафесіі паштальёна Марыя ХЛУД марыла з дзяцінства, і калі надышоў час, змяніла на гэтай пасадзе маці. У родным аграгарадку Вулька-2, што ў Лунінецкім раёне, яна працуе паштальёнам ужо 15 гадоў. І аб нейкай іншай рабоце ніколі ў жыцці не думала.

— На працягу ўсяго дзяцінства, юнацтва і маладосці перада мной быў прыклад добрасумленных, вельмі адказных аднасін да работы, — падкрэсліла Марыя Іванаўна. — Прыклад маёй мамы Евы Аляксееўны, якая працавала вясковым паштальёнам аж 26 гадоў. Дарэчы, у дзяцінстве я ёй ахвотна дапамагала, з вялікім задавальненнем і нават з гонарам разносіла аднавяскоўцам газеты і часопісы. І як прыемна было пачуць ад людзей падзяку за выкананне гэтых, на мой погляд, не вельмі значных паслуг.

Праўда, па словах Марыі Хлуд, пасля заканчэння школы яна паступіла у прафесійна-тэхнічнае вучылішча на спецыяльнасць мясаперапрацоўшчыка. Але як толькі ў роднай Вульцы з'явілася вакансія паштовага работніка, ні хвіліны не раздумваючы, уладкавалася на гэтую работу. Спачатку працавала начальнікам пошты: афармляла падпіску, прымала плацяжы, выдавала пасылкі і гэтак далей. А потым, калі маці выйшла на пенсію, замяніла яе ў якасці паштальёна.

— Не паверыце, але людзі спачатку блыталіся, — з усмешкай працягвае суразмоўніца. — Сядзяць, напрыклад, бабулі на лаўцы каля хаты. Адна кажа: паглядзіце — вунь Ева да нас ідзе. Другая адказвае: якая ж гэта Ева, яна ўжо на адпачынку. Гэта Марыя, яе дачка. Яна на пошце маці змяніла.

Падыду, і разам з імі смяёмся над такім выпадкам, жартуем. А ўвогуле, аднавяскоўцы, у першую чаргу людзі старэйшага ўзросту, мяне паважаюць. І я ім вельмі ўдзячная за гэта.

Самае прыемнае, што ёсць у нашай рабоце, — гэта магчымасць мець зносіны з шырокім колам людзей. У мяне ледзь слёзы не наварочваюцца, калі бачу, як радуюцца майму прыходу пенсіянеры. І не толькі з-за таго, што ім прыношу пенсіі. Ім так не хапае суразмоўнікаў! Я для іх — адзін з самых чаканых наведвальнікаў. У нейкім сэнсе вясковы паштальён — яшчэ і псіхолаг. Я ўвогуле лічу, што мае землякі — самыя ветлівыя людзі ў краіне.

Раней пошту і пенсіі дастаўлялі на асобныя хутары. Іншым разам прыходзілася ў дзень праходзіць пешшу ад 10 да 20 кіламетраў. Цяпер хутароў няма, і няма ўжо такіх нагрузак на мясцовых паштальёнаў.

Вельмі рада Марыя Іванаўна за дзяцей. Яны ўжо дарослыя. Дачка скончыла медыцынскі ўніверсітэт. Цяпер жыве ў райцэнтры, працуе ўрачом-дыягностам. У яе свая сям'я. Сын — студэнт апошняга курса БНТУ, праз год атрымае дыплом інжынера-механіка.

Задаволеная Марыя Хлуд і працоўным калектывам. У паштовым аддзяленні Вулька-2 жанчыны працуюць утрох. Усе — амаль равесніцы, агульную мову знойдуць заўсёды. Ды і кіраўніцтва да вулькаўскага калектыву ставіцца з павагай. Працуецца, карацей кажучы, з задавальненнем.

— Галоўнае маё жаданне — каб хутчэй скончылася пандэмія, — адзначае Марыя Іванаўна. — Гэтая жудасная хвароба столькі пакут людзям прынесла! А яшчэ — каб жылі беларусы пад мірным небам, каб расцілі дзяцей, каб працавалі спакойна і з задавальненнем...

Застаецца дадаць, што за добрасумленную плённую працу паштальён Марыя Хлуд атрымала падзячнае пісьмо ад Лунінецкага РВПС. А ў 2017 годзе яе партрэт з'явіўся на Дошцы гонару Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта». У 2021 годзе яна ўзнагароджана Ганаровай граматай абласнога філіяла.

Акцыя

Прафсаюзы — дзецям

Як паведаміла старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі РУП «Белпошта» Анжаліка Дробава, адным з асноўных напрамкаў дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі прадпрыемства з'яўляецца работа з дзецьмі, а таксама са шматдзетнымі сем'ямі работнікаў.

— Напярэдадні новага навучальнага года, у рамках дабрачыннай акцыі «Прафсаюзы — дзецям», пярвічная прафсаюзная арганізацыя РУП «Белпошта» аказвае матэрыяльную дапамогу шматдзетным, малазабяспечаным, няпоўным сем'ям, бацькам, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, а таксама сем'ям, чые дзеці пойдуць у першы клас, — удакладніла Анжаліка Яўгенаўна. — Усяго ў РУП «Белпошта» налічваецца 1437 такіх сем'яў. Акрамя таго, дапамога аказваецца падшэфным дзіцячым сацыяльным установам.

29 жніўня 2021 года ў ходзе правядзення культурна-спартыўнага свята сярод работнікаў прадпрыемства, прысвечанага Году народнага адзінства, на базе гарналыжнага цэнтра «Сонечная даліна» адбудзецца традыцыйная дабрачынная акцыя «У школу разам з РУП «Белпошта», у якой будуць браць удзел шматдзетныя сем'і работнікаў прадпрыемства, у якіх дзеці сёлета ўпершыню пойдуць у школу.

Па словах кіраўніка прафсаюзнай арганізацыі, на адрас дзіцячых сацыяльных устаноў прафсаюз штогод афармляе падпіску на дзіцячыя перыядычныя выданні, прадстаўнікі прафсаюза і адміністрацыі прадпрыемства наведваюць шматдзетныя сем'і і сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. У час такіх сустрэч дзецям уручаюцца падарункі: канцылярскія, школьна-пісьмовыя прылады, развіццёвыя гульні.

Другі год запар на базе адпачынку РУП «Белпошта» «Дружба» ў летні час гасцінна адчыняе дзверы дзіцячы лагер, у якім сёлета за пяць змен аздаравілася больш за 500 хлопчыкаў і дзяўчынак з усёй краіны. У рамках праграмы дзіцячага адпачынку праводзіцца шмат познавальных і творчых мерапрыемстваў, у тым ліку агляд-конкурс дзіцячай творчасці «Сузор'е талентаў» і мастацкі пленэр «Мы — нашчадкі Перамогі!», арганізаваныя Беларускім прафесійным саюзам работнікаў сувязі сумесна з пярвічнай прафсаюзнай арганізацыяй РУП «Белпошта».

Выпуск падрыхтаваў Сяргей РУЧАНАЎ.

Паехалі!

Міхаіл НАРЫНКЕВІЧ:

«ПРА 100-ГАДОВЫ ГРОДЗЕНСКІ ВЕЛАСІПЕД І ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ЭКСКУРСІІ»

Фантастыка! Уявіце: у Гродне 100 гадоў таму дзейнічаў завод веласіпедаў. Ён выпускаў дзесяць тысяч адзінак гэтага экзатычнага на той час транспарту штогод. Папулярнасць зашкальвала. Тагачасныя веласіпеды куплялі з не меншай ахвотай, чым цяпер купляюць BMB. Хто меў грошы, вядома. Экскурсавод Міхаіл НАРЫНКЕВІЧ паўдзельнічаў на такой даваеннай мадэлі ў міжнародным рэтрапрабегу. Нам сталі вядомы падрабязнасці мерапрыемства, а з імі адкрылася слаўнае веласіпеднае мінулае Гродна.

Закранулі з Міхаілам і «правакацыйныя» тэмы. Чаму калісьці гродзенскія веласіпеды пасунулі ўбок нямецкія мадэлі? Што нельга знайсці пра Гродна ў «Яндэкс» і Google? Чаму класічныя экскурсіі адыходзяць у нябыццё? І што робяць гродзенскія экскурсаводы, каб турысты зарадзіліся ўражаннямі на ўсе 100 працэнтаў?

ПРА МІЖНАРОДНЫ ПРАМЕНАД

Аматары актыўнасці і гісторыі штогод збіраюцца ва Украіне на рэтравелапрабег. За восем гадоў мерапрыемства знайшло гарачых прыхільнікаў па ўсім свеце. Сёлета з'ехацца ў Львоў усе ўдзельнікі аб'ектыўна не змаглі. Таму рэтравела стартаваў не толькі ва Украіне, але і ў Чыкага, Мілане, Мінску, польскіх Радаме і Кольбушаве. Найстарэйшаму ўдзельніку споўнілася 82 гады, наймалодшаму — два. З Мінска на прабег выехала цэлая сям'я: чатыры чалавекі на савецкіх веласіпедах. А інфармацыйную хвалю ўскалыхнуў Міхаіл Нарынкевіч на 100-гадовай мадэлі «Нёмана».

— Ідэя такая. Трэба паказаць веласіпед, што ты аднавіў, у арыгінальным выглядзе. Прыдумаць для яго адпаведны персанаж. У маім выпадку — даваенны веласіпед, — расказвае Міхаіл Нарынкевіч. — Я прачытаў гісторыю гродзенскага велазавода. Падабраў дакументы таго часу. Паглядзеў, як апраналіся людзі і каму быў даступны веласіпед. Перамяшчаліся ваенныя і інтэлігенцыя. Вырашыў, што мой тыпаж добра адпавядае ім. Апрануўся настаўнікам гімназіі 1930-х гадоў. Мае сябры займаюцца гістарычнай рэканструкцыяй. Штосьці для мяне знайшлі яны, а штосьці — я сам. Выбралі гарачы летні дзень — зладзілі фотасесію.

ГРОДЗЕНСКІЯ — КАНКУРЭНТЫ НЯМЕЦКІХ

— Міхаіл, які ж фітбэк вы атрымалі пасля рэтравелапрабегу? — пытаюся.

— Ведаеце, найперш задавальненне *(усміхаецца)*. Пракаціўся на старажытным веласіпедзе, падабраў удалы тыпаж. Пазнаёміўся з іншымі ўдзельнікамі. Фітбэк? Пра гродзенскі велазавод даведаліся далёка за межамі Беларусі. Зацікавіліся мінулым. Гэта важна, бо гісторыя ў нас бліскучая, але не кожнаму вядомая, — адказвае Міхаіл. — Актывізаваліся журналісты — і гродзенцы ўбачылі свой горад з новага боку, атрымалі нагоду для гонару. Ідэя знайшла прыхільнікаў. І ў будучыні плануем зладзіць рэтравелапарад у нас. Чаму не?

— Для тыповага гродзенца, які жыў 100 гадоў таму, веласіпед — гэта што? Неабходнасць? Раскоша? — цікаўлюся.

— Канец XIX стагоддзя — пачатак веларуху на Беларусі. І вось тады веласіпед быў раскошай. Моду стварыў Мікалай II. Ён катаўся на крутых англійскіх, французскіх мадэлях. І цана іх была, вядома, завоблачнай. Дваранства, шляхта ахвотна падхапілі захапленне цара. Велапрагулкі выхаднога дня лічыліся элітным адпачынкам. Велазавод «Нёман» знаходзіўся на сучаснай вуліцы Карла Маркса. У 1920—30-х гадах ён сказаў сваё слова, змяніў аблічча Гродна. За год выпускаў дзесяць тысяч веласіпедаў. Якасных, заўважу. Для тых часоў гэта былі здзіўляльныя маштаб і якасць. Аналаг BMB, калі хочаце. Найлепшыя копіі нямецкіх лідараў Durkopp. Дэталі везлі з Англіі. У Гродне варылі рамы з адлюстраваннем Новага замка. Цана стала адэкватнай. Інтэлігенцыя, часам нават звычайныя рабочыя ездзілі так па горадзе на работу, з работы, у рэстараны. І ў 1930-х веласіпед больш не раскоша, а топавы сродак перамяшчэння. Гродзенскія веласіпедысты, што жылі 100 гадоў таму, здавалі на правы (іх выдавалі на год), набывалі нумарныя знакі, станавіліся на ўлік у тагачасным ДАІ. Веласіпедыстаў праўраралі: ці ёсць званочак, святлоадбівальныя элементы? Таму гэта строгая гісторыя. Колькасць штрафаў на той час даказвала: веласіпедыстаў было столькі ж, колькі і цяпер.

Англійскія аналагі веласіпеда «Нёман» каштавалі ад 200 злотых пры вельмі падобнай да гродзенскіх таварышаў якасці. Апошніх можна было купіць за 140 злотых. У сістэме каардынат звычайнага работніка гэта прыблізна дзве зарплаты. Тое ж самае і сёння. Добры веласіпед можа каштаваць дзве тысячы рублёў. Будзем лічыць, што таксама два месяцы работы.

У XIX стагоддзі ў Гродне, Мінску і Віцебску падавалі прашэнне аб афармленні грамадскіх арганізацый веларуху. Актыўна развіваўся спорт, узнімалася актуальнасць здаровага ладу жыцця, людзі хадзілі ў паходы. Дзякуючы прашэнню, у горадзе стваралі спецыяльную прастору. На месцы сучаснага заапарка ў Гродне была агароджана тэрыторыя, арганізаваны выязны гандаль, ігралі духавы аркестр. Мужчыны і жанчыны ў прыгожым адзенні з прыгожымі веласіпедамі ўвечары выходзілі на праменад. Гэта была такая ж забава, як цяпер схадзіць у парк пакатацца на атракцыёнах.

ПРА ЭКСКУРСІІ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

Міхаіл Нарынкевіч — шырока вядомы ў Гродне экскурсавод. І мы проста не маглі абмінуць тэму экскурсійных трэндаў. Пагаварылі і пра самае актуальнае:

— У апошні год землякі як ніколі часта падарожнічаюць па Радзіме. Беларус, што раней планаваў адпачынак толькі ў еўрапейскіх ці далёкіх экзатычных краінах, сёння шчыра жадае ўбачыць Беларусь. Калі пытаць у Google, Яндэкс, «што паглядзець у Беларусі», то найперш з'яўляюцца запыты на Гродна. Тут нам, вядома, шанцуе. Гістарычны цэнтр захаваўся выдатна. Ёсць разнастайныя помнікі. Горад шматнацыянальны, размешчаны на паграніччы. Часам госці чакаюць, што ў Гродне ўсе гавораць па-польску, у крамах шукаюць польскія прадукты. Гэта нюансы, а важна толькі тое, што беларус цікавіцца мінулым Радзімы і разумее на прыкладзе Гродна: мы частка багатай старажытнай гісторыі. Турысты з Усходу едуць паглядзець найперш еўрапейскі горад, мінчане — адпачыць і на Аўгустоўскі канал. А замежнікі актыўна гастралі, калі дзейнічаў бязвіз. З 2016 года. І гэта былі літоўцы, палякі.

— І што іх здзіўляла найбольш? — пытаю.

— Гістарычныя факты часоў Стэфана Баторыя, Рэчы Паспалітай. Многіх здзіўляла, што ёсць два замкі. Усе ў захапленні ад гродзенскіх тэматычных рэстаранаў і кавярняў. Здзіўляла еўрапейскасць і добразычлівасць. Мясцовыя жыхары запрашалі турыстаў: «А давайце пакажам вам наш дворык». Узаемаўплыў каталікаў, праваслаўных, іўдзеяў таксама для многіх — дзіва, — кажа Міхаіл Нарынкевіч.

Ён упэўнены, што цяпер турызм стаў цікавым, індывідуальным. У Гродна едуць цэлымі сем'ямі. У мужоў, жонак, дзяцей розныя інтарэсы. Паходы ў паркі, заапаркі, а вечарам — знаёмства з кулінарыяй. Падача гістарычнай інфармацыі ў класічным выглядзе цяпер не моцна чапляе, таму з'явіўся запыт на інтэрактыўнасць.

— Анімацыя, гістарычная рэканструкцыя, рыцарскія баі, касцюмы, — пералічвае Міхаіл. — Людзі разумеюць: можна папярэдне ўзяць інфармацыю з адкрытых крыніц, пачытаць самастойна. А я ўжо паказваю тое, што анідзе не прачытаеш, — сапраўднае жыццё горада, эмоцыі. Дворыкі, сустрэчы з мастакамі, музыкамі, іншымі выбітнымі асобамі. Не проста глядзець, а паглыбляцца. Шалёнай папулярнасцю карыстаюцца сплавы на байдарках па Аўгустоўскім канале. І велападарожжы, якія прапаноўваю я. Так уражанняў удвая больш. Цяпер у маім прыярытэце — велаэкскурсіі і экскурсіі для дзяцей, у тым ліку з асаблівасцямі развіцця. Актыўнасці, інтэрактывы. Маю тры маршруты: экскурсійны, вела, і байдарачны.

Павінна быць цікава.

Маргарыта САДОЎСКАЯ.

Навінкі ад «Звязды»

РАЗАМ З КАЗАЧНЫМ ГЕРОЕМ

Кацярыну ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВУЮ добра ведаюць юныя чытачы Беларусі. Кнігі пісьменніцы, якая ўжо больш як дзесяць гадоў вядзе свой нязмушаны рэй з маленькімі хлопчыкамі і дзяўчынкамі, не залежваюцца ў кнігарнях, на паліцах школьных бібліятэк. Ёсць у прозе спадарыні Кацярыны элементы добразычлівай, займальнай гульні. Чытач і сам не заўважае, як становіцца яе ўдзельнікам, трапляе ў вір прыгод, падарожнічае па розных прасторах.

Дарэчы, ці не большасць кніг К. Хадасевіч-Лісавой выходзіць у Выдавецкім доме «Звязда». Можна сказаць, у частцы знаёмства з беларускай дзіцячай літаратурай тым самым выдавецтва зрабіла сваім брэндам мастацкія творы спадарыні Кацярыны. Вось і казачная аповесць «Прыгоды лісачкі Красуні» — чарговая навінка «Звязды». Пра што расказвае кніга? Абаяльная і вясёлая гераіня казачнай аповесці Красуня перасялілася ў Дзівосны лес з мегаполіса. Яе гарадское мінулае мае таямніцу, якую яна не спяшаецца раскрываць. На новым месцы лісачка шукае і знаходзіць сяброў. Разам з казачнымі героямі чытач перажыве захапляльныя прыгоды, нечаканыя падзеі, страшныя здарэнні і нават разблытае сапраўдную дэтэктыўную гісторыю.

Дзесяць гісторый уключаны ў казачную аповесць: «Лісачка-навасёлка»; «Лісачка нямодная»; «Лісачка — прынцэса фон баранеса і вядзьмак»; «Лісачка і небяспечнае здарэнне»; «Лісачка — апавядальніца жахліўчыкаў»; «Лісачка наймае дэтэктыва»; «Лісачка адкрывае таямніцу»; «Лісачка і самы шчаслівы дзень»; «Лісачка і чупакабра»; «Лісачка, вампір і кава для мядзведзя». Кожная з красамоўных назваў сведчыць пра пэўнае дзейства, выказвае перад чытачом абяцанне, што ў аповесці-казцы разгорнецца цудоўны спектакль з некалькіх дзей.

У канцы кнігі аўтар і выдавецтва прапануюць уважлівым чытачам паўдзельнічаць у «Квэсце па Дзівосным лесе». А ілюстрацыі да кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой «Прыгоды лісачкі Красуні», якая ўбачыла свет тыражом 1100 экзэмпляраў, зрабіла кніжны графік Вольга Шпакоўская.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!
КАРТА ПОКУПОК

ОТЧЕТ О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«ПОКУПКА УДАЧИ 6.0»

Место и дата составления отчета:
20.08.2020 г.
г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328.
1. Организатор: Общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн», 220030, г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328, УНП 190624910.
2. Наименование рекламной игры – «Покупка удачи 6.0».
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3975 от 23.04.2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.
4. Срок начала рекламной игры: 03 мая 2021 г.
Срок окончания рекламной игры: 31 августа 2021 г
5. Количество участников рекламной игры: 12 104 участников.
6. Призовой фонд разыгран полностью.
7. Победители рекламной игры:
Главный приз 10 000,00 рублей. Победитель Лапицкий Валерий Николаевич, г. Речица и 1 000 (Одна тысяча) победителей. Каждый победитель выиграл денежный приз в размере 100,00 (Сто) белорусских рублей 00 копеек. Все призы перечислены на расчетные счета Победителей до 30 августа 2021 (включительно).
Список победителей находится на сайте ОАО «Белгазпромбанка», www.belgazprombank.by, в разделе «Новости».
8. Для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 17 209-90-03.
9. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было.
УНП 190624910
Директор ООО «ТриВижн» Кухарчик Е.Н.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Сентябрь на Драйве! Мастеркард»

1. Организатор Рекламной игры

Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

2. Наименование и территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра имеет наименование «Сентябрь на Драйве! Мастеркард» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

3. Срок начала и окончания Игры

Игра проводится с 01 сентября 2021 г. по 12 ноября 2021 г. (включая срок выдачи выигрыша и опубликования результатов проведения Игры).

4. Комиссия по проведению Игры

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

1. Даниленко Валерий Михайлович – Управляющий ООО «Рефорте», председатель комиссии;

2. Швед Екатерина Александровна – специалист по работе с клиентами ООО «Рефорте»;

3. Кузнецов Дмитрий Владимирович – индивидуальный предприниматель;

4. Даниленко Ольга Михайловна – специалист по рекламе ООО «Рефорте Групп»;

5. Чефанова Маргарита Игоревна – бухгалтер ООО «Рефорте».

5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard, эмитированных банками Республики Беларусь (далее – Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, для оплаты покупки топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Игры

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства.

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

- в период с 01 сентября 2021 г. по 30 сентября 2021 г. включительно совершить не менее трех покупок топлива отдельными чеками в различные даты по Карте Mastercard, эмитированной банками Республики Беларусь, за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 1 (одного) белорусского рубля в каждом чеке с использованием зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты Участника Игры (в дальнейшем – Карта «Заправка»), которая определяет физическое лицо как участника программы поощрения клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа «Заправка»), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

